КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА
3 КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 39 (1322) 30 верасня 2017 г.

Рэканструкцыя палаца Пуслоўскіх у Косава пачалася ў 2008 годзе. У лістападзе яго плануюць часткова адкрыць для першых наведвальнікаў. "К" давялося ўбачыць будынак не толькі звонку, але і ўнутры ўжо цяпер.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Замак без замка́

Архітэктар Уладзімір КАЗАКОЎ з 1989 года займаецца пытаннямі рэканструкцыі палаца Пуслоўскіх у Косава.

У Дні еўрапейскай спадчыны, калі ў апошнія выхадныя верасня з нагоды гэтай міжнароднай акцыі адчыняюцца дзверы шматлікіх культурных і гістарычных помнікаў, мы выправіліся ў Косава. Па дарозе туды кіроўца, які вязе нас з Івацэвічаў, кажа, што ўсе мясцовыя жыхары чакаюць, калі ж нарэшце завершыцца рэстаўрацыя — цікава паглядзець на яе вынікі. Бо даследаваць руіны, у якія палац XIX стагоддзя ператварыўся пасля пажару 1944 года, мог кожны ахвотны, пакуль замак у 2008 годзе не абнеслі агароджай — тады пачаліся работы па ўзнаўленні будынка.

Стаіць ён на ўзвышшы побач з дарогай — не заўважыць яго немагчыма. Спыняемся каля музея-сядзібы Тадэвуша Касцюшкі. Краявід з аўтастаянкі нагадвае знакамітую гравюру Напалеона Орды: на першым плане драўляны дом нацыянальнага героя Польшчы, ЗША, Літвы і Беларусі, на другім — Косаўскі замак. Адсюль ён выглядае як новы — са свежым белым фасадам, рознакаляровымі вокнамі. Падыходзім бліжэй — і толькі тады заўважаем рабочых, што даводзяць да ладу лесвіцу і цэментуюць ганак.

ст. 2 — 3

Соцыум

ПАДЫХОД ДА "АСАБЛІВЫХ ЛЮДЗЕЙ"

Што такое інтэграцыя і чым яна адрозніваецца ад дабрачыннасці, а таксама пра дапушчальныя межы арт-тэрапіі рэдактар "К" гутарыць з псіхолагам дома-інтэрната ў Навінках Дар'яй ЯСКЕВІЧ.

ст.4

а"К"но ў свет

"НЕ ВАРТА БЫЦЬ ТЭАТРАЛЬНЫМ МАКДОНАЛЬДСАМ", —

падчас свайго візіту ў Мінск на форум "ТЭАРТ" французскі харэограф Анжэлен ПРЭЛЬЖАКАЖ распавёў "К" пра відовішчнасць і авангард.

ст.6

Тэатральная плошча

МІРНЫЯ СЦЭНЫ "ВАЙНУШКІ"

Што за "Гульня ў салдацікі, альбо Камедыя пра чалавека, які не змог сказаць "не" атрымалася ў Аляксея Ляляўскага, пішуць аглядальнікі "К", якія паглядзелі спектакль Mann ist Mann.

ст.8 — 9

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Афіцыйна

У Беларусі — новыя міністры

Юрый Бондар.

Алесь Карлюкевіч.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 28 верасня прыняў шэраг кадравых рашэнняў.

Як паведамляе афіцыйны інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, кіраўнік дзяржавы прызначыў Бондара Юрыя Паўлавіча Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь, Карлюкевіча Аляксандра Мікалаевіча — Міністрам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Бондар Юрый Паўлавіч нарадзіўся 11 красавіка 1973 года ў Мінску. Скончыў у 1997 годзе юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці "правазнаўства", у 2007 годзе — Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці "дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай". У 2006 годзе абараніў дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата палітычных навук па спецыяльнасці "тэорыя палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі" ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У 2009 годзе Юрыю Бондару прысвоена вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці "паліталогія".

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў Юрый Бондар працаваў з 2001 года на пасадах выкладчыка, старшага выкладчыка, дацэнта кафедры культуралогіі, першага прарэктара. У лютым 2013 года быў прызначаны на пасаду рэктара БДУКіМ.

Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч нарадзіўся 8 студзеня 1964 года ў вёсцы Зацітава Слабада Пухавіцкага раёна. Скончыў аддзяленне журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча (1985), да 1995 года служыў ва Узброеных Сілах. Пасля дэмабілізацыі працаваў адказным сакратаром рэдакцыі газеты "Культура", далей — у газетах "Звязда", "Чырвоная змена", "Советская Белоруссия". У 2006 годзе атрымаў прызначэнне на пасаду дырэктара РВУ "Літаратура і мастацтва", у 2011 годзе стаў галоўным рэдактарам газеты "Звязда", затым дырэктарам аднайменнага Выдавецкага дома. У 2016 годзе прызначаны намеснікам міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Аншлагі дэбютнага фэсту

Першы Мінскі міжнародны фестываль цыркавога мастацтва адбыўся — ва ўсіх сэнсах! Скончыліся і чатыры дні — з 21-га па 24-е верасня — марафона (або спрынтарскай дыстанцыі?) у Белдзяржцырку, а глядацкія перааншлагі і вялікая ўвага да форуму не толькі беларускіх, але і замежных спецыялістаў пацвердзілі, што ў такім мерапрыемстве краіна мела патрэбу. Мы будзем з нецярпеннем чакаць наступнага фэсту, а пакуль "К" падводзіць вынікі дэбютнага і называе яго лаўрэатаў.

Алег КЛІМАЎ

Ад прафесійнага журы "золата" атрымалі "Акрабаты-вальтыжоры "Людзі ў чорным" пад кіраўніцтвам Уладзіміра Вавілава (Расія) і каманда артыстаў з Паўночнай Карэі; "срэбра" — расійскія "Арыгінальныя акрабаты на двайной палцы" пад кіраўніцтвам Ілы Цюфяева і беларускія "Паветраныя гімнасты на палотнах" пад кіраўніцтвам Веранікі Рыбчонак; "бронзу" — нумары "Свабодны дрот" Зу Х'ен Нгуен Зі з В'етнама і "Паветраны гімнаст "Фенікс" Джэка Даўсена з Аўстраліі.

Прыз грамадскага журы выйграў "Эквілібр на трысцінах" Хан Гук Рэна (КНДР), дзіцячага — "Камічныя талерачкі з сабачкам" Лівіў Тудор (Румынія). Прыз глядацкіх сімпатый заваяваў атракцыён "Нубійскія львы і бенгальскія тыгры" пад кіраўніцтвам Хамада Куты (Егіпет), а прыз старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэя Шорца — "Вертыкальны палёт" пад кіраўніцтвам Мікалая Сарычова (Расія).

За правядзенне дадзенага цыркавога форуму калектыў Беларускага дзяржаўнага цырка адзначаны Гран-пры.

К

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

"Будзе культурна-турыстычны цэнтр"

Каля ўвахода на будоўлю сустракаемся з прарабам Міхаілам Дылько, які тлумачыць нам, што да лістапада трэба скончыць агульнабудаўнічыя працы, каб адкрыць для наведвальнікаў некалькі залаў унутры палаца. Пакуль жа ён абнесены сеткай, і паглядзець на яго можна толькі звонку.

Каля агароджы акурат спыняецца пара турыстаў, пытаюцца, ці можна зайсці.

— У лістападзе ўжо будзе можна некалькі залаў паглядзець, — адказвае ім прараб.

— А калі ўвогуле ўсё адкрыюць, і што тут потым будзе? — цікавяцца падарожнікі.



Для завяршэння работ па рэканструкцыі Косаўскага замка патрэбна не менш за 5 гадоў.

Гравюра Напалеона Орды.

Замак без замка́



Уладзімір Казакоў расказвае, як будуць выглядаць пакоі палаца.

Від з акна Чырвонай залы на другім паверсе.

— Калі — дакладна сказаць складана. А будзе культурна-турыстычны цэнтр: кафэ, гасцініца, музей.

— І такія пытанні кожны дзень, — гэта Міхаіл Дылько тлумачыць ужо нам. Але мы і самі бачым два турыстычныя аўтобусы, што спыняюцца ля дома Касцюшкі. За год яго наведвае каля 20 тысяч чалавек. Супрацоўнікі музея адзначаюць, што амаль усе яны потым ідуць да палаца, каб убачыць яго хаця б звонку.

"Хацелі зрабіць міжгаспадарчы прафілакторый"

Вялікая цікавасць падарожнікаў да архітэктурнага помніка і паспрыяла ўзнаўленню палаца Пуслоўскіх. Упершыню спроба распачаць яго рэканструкцыю была зроблена яшчэ ў 1989 годзе. Тады заказчыкам выступіў мясцовы саўгас "Савецкая Беларусь" у вёсцы Мілейкі.

— Любое архітэктурнае збудаванне патрабуе не толькі рэканструкцыі, але і прыстасавання. Тады старшыня саўгаса хацеў зрабіць тут міжгаспадар-

*

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2017. Наклад 4 027. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 29.09.2017 у 20.30. Замова 3291. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

чы прафілактарый, — узгадвае аўтар і навуковы кіраўнік архітэктурнага праекта Уладзімір Казакоў, які прыехаў у Косава з Брэста сачыць за ходам работ. — Але ў 1989 годзе разам з камісіяй Міністэрства культуры па ахове гісторыка-культурных помнікаў мы прыйшлі да высновы, што элементы музеефікацыі ўсё ж такі павінны тут быць, перамовы з саўгасам пра рэканструкцыю спыніліся на нейкі час. Пасля распаду Саюза былі яшчэ спробы прыцягнуць сюды інвестараў, але няўдалыя. Тады аблвыканкам прыняў мудрае і гераічнае рашэнне ўзяць гэта ўсё на сябе. Але пачалі мы з дома Касцюшкі. На яго месцы стаяў камень, абнесены цэпам. Польскае пасольства падзялілася з намі чарцяжамі з архіваў. Вялікую падтрымку аказаў фонд Тадэвуша Касцюшкі, які тады ўтварыўся (ініцыятарам справы быў Леанід Несцярчук).

Урачыстае адкрыццё ўзноўленага дома Тадэвуша Касцюшкі адбылося ў 2004 годзе. У Косава сталі прыязджаць турысты, паступова ўсё больш людзей звяртала ўвагу на стан палаца.

— За лесам вакол замка яго самога не было бачна, таму з дазволу мясцовых уладаў мы вырубілі некаторыя дрэвы, каб з дарогі будынак стаў заўважны, — расказвае Уладзімір Казакоў. — Чалавек выйшаў з музея, а праз дарогу ўбачыў палац. Што там? Руіны. На гэтай хвалі ўвагі нам удалося атрымаць фінансаванне аблвыканкама на праект рэканструкцыі, якая пачалася ў 2008 годзе і цягнецца амаль дзесяць гадоў.

"Правы флігель — кавярня, левы — гасцініца"

Матэрыялаў, з якіх можна даведацца пра выгляд фасада рэзідэнцыі Пуслоўскіх і інтэр'ераў палаца да пажару, захавалася вельмі мала — усяго некалькі фотаздымкаў і тэкставых апісанняў.

— Узнаўлялі па аналагах, таксама пабудаваных у той час у стылі неаготыкі, — кажа архітэктар, пакуль мы ідзем да ганка. — Напрыклад, па апісаннях там, дзе мы цяпер знаходзімся, былі скульптуры і фантаны. Скульптуры мы бачылі на фота і нават знайшлі месца, дзе яны стаялі. А вось фантан доўга не маглі адшукаць, зразалі грунт. Неяк я падняўся на вежу і адтуль раптам убачыў выразны эліпс фантана. Мы таксама перанеслі яго ў праект, але да тэрыторыі каля палаца прыступім потым.

Пакуль жа трэба давесці да ладу будынак, што мусіць стаць грамадскім культурна-турыстычным цэнтрам — месцам для сустрэч і фестываляў з гасцініцай, з рэстаранам і музейнымі памяшканнямі.

Праз цэнтральны ўваход трапляем у невялікую гасцёўню. Дзверы справа вядуць у Белую залу — так называлі гэта памяшканне ўладальнікі палаца, якія таксама праводзілі тут афіцыйныя сустрэчы. Пакуль гэта пакой з голымі сценамі, дзе ўсталяваны планшэты з фотаздымкамі, на якіх можна ўбачыць, якім палац быў і якім будзе пасля рэканструкцыі.

— Звярніце ўвагу на фрэскі на старым фотаздымку Белай залы — іх узнавім, — кажа Уладзімір Нахімавіч. — Паставім і камін. Фурнітуру на вокнах таксама ўзнаўлялі па апісаннях.

У суседнім пакоі ўстаўляюць апошняе акно. Мяркуецца, што з лістапада менавіта ў памяшканні першага паверха змогуць зайсці турысты.

У правым флігелі, які пакуль зачынены, размесціцца кавярня. Левы перабудоўваюць пад гасцініцу. Уваход туды знаходзіцца з адваротнага ад дарогі боку, хаця першапачаткова гэта і былі цэнтральныя дзверы ў палац.

— Калі праводзілі раскоп у гэтай частцы будынку, выявілі цагляную лесвічку — аказваецца, тут была печ. Вырашылі захаваць яе рэшткі, — паказвае Уладзімір Казакоў. — Накрыем гэтую прастору шклом — будзе фрагмент музейнай экспазіцыі побач з жылымі памяшканнямі.

На першым паверсе рыхтуюцца невялікія нумары для гасцей і для персанала, на другім — рэсэпшн і яшчэ некалькі пакояў. Самы вялікі складаецца з трох частак — амаль кватэра. З вакна будучага віп-нумара відаць дом Касцюшкі, вадасховішча і яшчэ адну экскурсійную групу, што разглядае палац з-за агароджы.

Па другім паверсе пераходзім у цэнтральную частку палаца. Тут магчымасцей ацаніць шыкоўны краявід яшчэ больш — шкляныя дзверы-вокны выходзяць на балкон. Пакуль ён прыкрыты фанерай, але хутка тут з'явіцца агароджа з чыгунным ліццём. На ўзроўні другога паверха знаходзіцца і Чырвоная зала. Калісьці тут праводзілі балы, а неўзабаве таксама будуць адбывацца святочныя мерапрыемствы.

— Усе магнаты насычалі інтэр'ер карцінамі і габеленамі, — кажа Уладзімір Нахімавіч. — Мы зробім гэтак сама. На жаль, дакладных звестак пра замак захавалася мала, пра гэтую частку ўвогуле ніякіх.

Затое захавалася шмат легендаў. Архітэктар ставіцца да іх з гумарам.

— Пішуць, што тут леў хадзіў. Ну дзе ён мог тут хадзіць? — смяецца суразмоўца. — Каб рыбкі ў падлозе плавалі, таксама патрэбна сур'ёзная тэхнічная падрыхтоўка. Дванаццаць веж замка быццам сімвалізуюць кожны з месяцаў? Палічыце — іх толькі восем. Але прыгожыя гісторыі павінны быць у любога будынка, бо гэта значыць, што ён напоўнены жыццём. Упэўнены, як толькі сюды пачнуць заходзіць экскурсійныя групы, хутка з'явяцца новыя легенды.

"У 1989 годзе тут былі толькі сцены без даху"

Калі некалькі залаў адкрыюць для наведвання, там размесціцца экспазіцыя, што знаёміць з жыццём замка, Косава, усяго раёна. Рабочыя працягнуць працу ў іншых памяшканнях.

— Палац унікальны па сваёй архітэктуры! У Беларусі захаваліся іншыя неагатычныя будынкі XIX стагоддзя, але другога настолькі маштабнага няма — гэта адна з найпрыгажэйшых рэзідэнцый у краіне. Яе ўсе павінны ўбачыць, — перакананы навуковы кіраўнік.

Натуральна, тэрміны канчатковага завяршэння будоўлі залежаць ад фінансавання з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. Па словах Уладзіміра Казакова, самы аптымістычны прагноз — гэта яшчэ пяць гадоў.

— Можна па-рознаму глядзець на цяперашні стан палаца, — разважае архітэктар. — Хтосьці скажа, што нічога асаблівага не зроблена — на першы погляд, цэгла ды цэмент. Але ўявіце, што ў 1989 годзе тут былі толькі сцены без даху, усё завалена смеццем да ўзроўню першага паверха, а ўнутры руінаў раслі дрэвы. У 1990-м годзе будаўнічы атрад педінстытута два месяцы тут выграбаў завалы, якія потым перапрацоўвалі яшчэ і археолагі. Параўнайце з тым, што бачыце. Ведаеце, які б я помнік тут паставіў, калі палац адкрыецца? Вось такі! — паказвае ў бок тачкі з цэментам Уладзімір Нахімавіч. — 90 працэнтаў таго, што тут зроблена — ручная праца! І яна яшчэ не завершана.

К

Мемарыяльны музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі - амаль як на гравюры.

З гэтага боку будзе ўваход у гасцініцу.



У XIX стагоддзі ў дом Пуслоўскіх госці заходзілі праз гэтыя дзверы.

РВУ "Культура і мастацтва" запрашае на працу вядучага спецыяліста аддзела маркетынгу

Патрабаванні: досвед работы па спецыяльнасці не меней за тры гады, разуменне спецыфікі друкаваных СМІ, абавязковасць, крэатыўнасць мыслення.

Рэзюмэ просім дасылаць на электронную пошту kultura@tut.by

Страта

Апошні геній сваёй эпохі



Памёр кампазітар Дзмітрый Смольскі. І разам з ім сышла цэлая эпоха. Народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі краіны, прафесар, ён заставаўся апошнім з магіканаў, завяршыўшы эпоху беларускага сімфанізму бетховенскай моцы.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Справа не ў колькасці сімфоній (а іх ажно 16, чым у XXI стагоддзі рэдка можа пахваліцца хтосьці з сусветных кампазітараў). Справа ў іх канцэпцыйнасці — філасофскай і ўласна музычнай. Сваімі творамі ён не "распавядаў гісторыі", а прымушаў задумацца. Пры ўсёй іх мастацкай прывабнасці, структурнай адточанасці (нотка да ноткі — як цаглінка да цаглінкі, каменьчык да каменьчыка), архітэктурнай выверанасці (ад старадаўніх храмаў да фантазій Гаўдзі), галоўнай дзейнай асобай заставалася жывая чалавечая думка.

Ён заўсёды быў наперадзе. У 1960-я адным з першых пачаў актыўна звяртацца да заходняга авангарду, прыйшоўшы ў выніку да закладання асноў беларускага постмадэрну — з акцэнтам менавіта на яго беларускасці. У 1970-я пераасэнсаваў паэзію Янкі Купалы савецкага часу, выявіўшы ў музыцы сваёй араторыі "Паэт" яе сапраўдны, зусім не "аддана камуністычны" сэнс. Звярнуўся да беларускай даўніны, стварыўшы ў 1978-м першую рэдакцыю оперы "Сівая легенда" (яе другая рэдакцыя — у цяперашнім рэпертуары нашага Вялікага тэатра), а праз два гады — оперу "Францыск Скарына", якая была ўвасоблена на тэлебачанні. У 1991-м зрабіў сучаснае музычнае прачытанне беларускай оперы XVIII стагоддзя "Апалон-заканадаўца, ці Рэфармаваны Парнас" Рафаэла Вардоцкага.

Дзмітрый Смольскі першым у Беларусі з'яднаў з сімфанізмам рок, якім зацікавіўся яго сын Віктар, стаўшы сусветна вядомым гітарыстам. Спачатку напісаў некалькі рок-кампазіцый, якія выконваліся (неверагодна па тых часах!) у справаздачным канцэрце Саюза кампазітараў. Потым — дзве сімфоніі з электрагітарай, абсалютна розныя не толькі па задуме, але і па ролі саліруючага інструмента.

Выкладчыцкая дзейнасць кампазітара ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — асобная, вельмі значная частка яго жыцця. Выпускнікі класа Смольскага складаюць сёння ядро сучаснай беларускай музыкі. Усе яны вельмі розныя: Дзмітрый Браніслававіч ніколі не імкнуўся зрабіць з іх "маленькіх смальчанятаў". Але кожны — з адметным канцэпцыйным мысленнем і добрым веданнем аркестравых сродкаў. Менавіта гэтыя якасці і развіваў у іх знаны майстра.

Юбілейная вечарына кампазітара (улетку яму споўнілася 80), запланаваная 17 кастрычніка ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі, пройдзе ўжо без яго. Але будуць гучаць яго творы. Так, музыка Дзмітрыя Смольскага павінна гучаць! І не толькі ў сувязі з пэўнымі датамі. Бо гэта не проста даніна памяці, а наша сучаснасць, убачаная і адлюстраваная вачыма вялікага мастака.

Рэдакцыя "К" смуткуе аб страце такой постаці ў беларускай музыцы і выказвае спачуванні сям'і, сябрам і калегам Дзмітрыя СМОЛЬСКАГА.

К

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю выдатнага кампазітара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, народнага артыста Беларусі Дзмітрыя Браніслававіча СМОЛЬСКАГА і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім, калегам і сябрам.

Падыход да “асаблівых людзей”

На звычайнае сацыяльнае мерапрыемства ўсё гэта мала падобна. Зайшоўшы ў актавую залу, трапляеш у вясёлую і нязмушаную атмасферу дыскатэкі, наведвальнікі якой зліліся ў адзіным парыве эмоцый. Хаця няцяжка заўважыць, што выглядаюць яны зусім па-рознаму. Частка публікі — гэта насельнікі Псіханеўралагічнага дома-інтэрната № 3 у сумнавядомых Навінках. Другая частка — “звычайныя” маладыя людзі, што прыйшлі да іх у госці. Самыя розныя па сваім характары культурныя імпрэзы ладзяцца ў гэтых сценах рэгулярна, а іх апагеем вось ужо ў трэці раз стаў інтэграцыйны праект “Адкрыты жнівень”. Пра тое, што такое інтэграцыя і чым яна адрозніваецца ад дабрачыннасці, а таксама пра дапушчальныя межы арт-тэрапіі, мы гутарым з ініцыятарам гэтай дзейнасці — псіхолагам дома-інтэрната Дар’яй ЯСКЕВІЧ.

Грайндкор у інтэрнаце. / Фота Ягора БАБІЯ

Ілья СВІРЫН

— Як давялося заўважыць, адносіны многіх да людзей з псіхічнымі захворваннямі нагадваюць адносіны да смерці. Гэта непажаданая, бадай табуяваная тэма, якую можна закрануць хіба ў легкадумным ключы, а яшчэ лепей не закранаць наогул.

— Думаю, наспела пара заўважыць тых людзей, якія жывуць у трохі іншых умовах — трэба адзначыць, экзістэнцыяльна складаных, — і выпрацаваць адэкватнае да іх стаўленне. Уласна, менавіта на гэта мы і разлічваем, ладзячы тыя імпрэзы, падчас якіх дзверы ўстановы расчыняюцца для ўсіх ахвотных. Падкрэслю: наша дзейнасць скіраваная не толькі на тых, хто жыве ў псіханеўралагічным інтэрнаце, але і на ўсё грамадства. Па сутнасці, мы проста ствараем у Мінску новую культурную пляцоўку, хай і ў такім нязвыклым для многіх месцы. Урэшце, не будзем забываць, што інтэрнат — гэта ж таксама частка горада.

— Зазвычай дабрачыннасць разглядаецца як аднабокі працэс: здаровыя павінны нешта даць хворым…

— Ведаеце, сама такая пастаноўка пытання адразу ўзвышае адных людзей над іншымі. Мне гэты падыход не падабаецца. Мы ўсе з’яўляемся адзіным грамадствам, не падзеленым на касты і гатункі, мы ўсе роўныя і маем роўныя правы, хай і пры розных умовах. Агульная культурная пляцоўка ўсталёўвае гэтае паняцце на ўзроўні топаса. Мы не просім — мы супольна нешта ствараем.

— Якім чынам вы адбіраеце ўдзельнікаў?

— У большасці выпадкаў, яны знаходзяцца самі. Прыкладам, неяк на нас выйшлі прадстаўнікі беларускай сайкабілі-сцэны, і выявілася, што гэтая музыка тут — сама тое! Насельнікі інтэрнату шчасліва танчылі ў абдымку з медперсаналам і панкамі, якія выпадкова зазірнулі на агеньчык. Чым увогуле для нас карысныя розныя субкультуры: у іх ідэалогіі легалізаванае лёгкае шаленства. Як сведчыць наша практыка, у плане інтэграцыі гэта адыгрывае станоўчую ролю — бачачы незвычайных людзей з іракезам альбо кантрабасам, насельнікі інтэрната іначай успрымаюць сваю “незвычайнасць”.

Што самае важнае, тыя выступоўцы сталі падтрымліваць нас і надалей, пастаянна наведваючы інтэрнат, наладзіўшы сяброўства з яго жыхарамі і ведаючы многіх з іх пайменна. Адпаведна, стварылася рэальная эмацыйная повязь. З’явілася ідэя зладзіць у інтэрнаце міжнародны фэст сайкабілі! Гэта было б крута, але…

— Напэўна, тут павінна ўзнікнуць пытанне фінансаў?

— На сёння мы робім усё наогул без грошай. Адзіны рэсурс — сам інтэрнат. Трэба адзначыць, што яго адміністрацыя ставіцца да нашых ініцыятываў вельмі станоўча. Вось добрае сведчанне таго, што дзяржустановы могуць быць вельмі прагрэсіўнымі і смелымі, адэкватна разумеючы перажыванні людзей з абмежаваннямі.

— Леташні “Адкрыты жнівень” запомніўся ўдзелам у ім брутальнай грайндкоравай каманды, дзе адна з жыхарак інтэрнату выступіла ў ролі “запрошанай вакалісткі”. Відэа набрала процьму праглядаў, але і выклікала дыскусіі…

— Я таксама хвалявалася адносна таго канцэрту: ну давайце мо паспрабуем пару песенек, паглядзім, якой будзе рэакцыя публікі. А публіка ў парыве весялосці стаптала пад гэты грайндкор увесь газон у нашым двары!

— Аднак экстрэмальную музыку многія лічаць шкоднай для псіхікі — прынамсі, у выпадку з людзьмі, якія маюць з ёй сур’ёзныя праблемы.

— Найперш, я моцна сумняюся ў тым, што нейкая музыка сама па сабе здатная нашкодзіць псіхіцы. Да ўсяго, у нас — так бы мовіць, здаровых людзей — ёсць самасвядомасць і права выбару. Калі ты жывеш не ў інтэрнаце, а ў звычайнай кватэры, дык можаш сам вырашаць, які канцэрт наведаць. А калі табе там не спадабаецца, ты ўстаеш ды сыходзіш. Чаму жыхары інтэрнату павінны быць гэтага выбару пазбаўлены? Чаму нейкія дабрадзеі маюць за іх вырашаць, што ім карысна, а што не? Паводле якога права? Відавочна, тут ёсць пэўная лагічная пастка. З аднаго боку, мы называем гэтых людзей роўнымі, але з іншага — надзяляем сябе паўнамоцтвамі кантраляваць іх густы. Ёсць цудоўны лозунг: “Нічога без нас!” Мы не маем права прымаць рашэнне за людзей з пэўнымі абмежаваннямі і асаблівасцямі — тым больш, калі справа тычыцца культурных прэферэнцый. Гэта відавочна нават у прававым, а не толькі ў этычным полі.

— Але бацькі часам аберагаюць дзяцей ад тых ці іншых культурных прадуктаў, беручы на сябе пэўную адказнасць ды вырашаючы за іх, што ім трэба, а што не…

— …і тым самым перашкаджаючы іх сталенню. Трэба памятаць, што чалавек фарміруецца як асоба ў тым ліку і праз канфлікты, праз сутыкненне з нечым новым і нязвыклым. Мы расцём і развіваемся менавіта ў сітуацыі выбару. І пазбаўляючы людзей, скажам, з сіндромам Даўна права выбару, мы перашкаджаем іх развіццю. І таму я лічу сябе абавязанай даць жыхарам інтэрнату магчымасць пачуць самую розную музыку, уключна з экстрэмальнай. Гэтаксама я абавязана пазнаёміць іх з творчасцю Шнітке, аўтэнтычным беларускім фальклорам — або, скажам, песнямі Міхаіла Круга (а ўсё гэта раз-пораз у нас гучыць). Бо як ты можаш зрабіць выбар, калі не ведаеш, з чаго выбіраць?

— А калі знаёмства выкліча негатыўную рэакцыю?

— Калі табе не падабаецца, ты можаш сысці. Сказаць валанцёрам альбо камусьці з медперсаналу, што імпрэза табе не да густу, ды вярнуцца ў іх суправаджэнні назад у пакой.

— Мяне здзівіла, што з канцэрта класічнай музыкі сышоў усяго адзін чалавек, а ўся зала была ў захапленні…

— Магу запэўніць, Міхаіл Круг таксама пайшоў на ўра. Прычым для мяне тая вечарына стала рэальнай інклюзіяй, бо дадзены выканаўца раней быў выключаны з майго інфармацыйнага поля. Ніколі не позна даведацца нешта новае.

— “Асаблівыя людзі” здзіўляюць сваёй непасрэднасцю…

— І мастацтва яны ўспрымаюць гэтаксама непасрэдна ды абавязкова скажуць менавіта тое, што думаюць. Гэта добрая лакмусавая паперка для музыкантаў альбо тэатралаў: калі ты змог працаваць тут, зможаш працаваць з любой публікай.

— Ці можна прыйсці да нейкіх заканамернасцяў, назіраючы за рэакцыяй вашай аўдыторыі на розныя тыпы мастацтва? Што ім найбольш падабаецца?

— Груба кажучы, тое самае, што і ўсім. Прыкладам, складанае канцэптуальнае мастацтва не знаходзіць водгуку ў доме-інтэрнаце! Хаця і тут здараюцца выключэнні. Падчас мінулага фэсту мы экспанавалі сучасны жывапіс мастачак Ганны Асяненкі і Кацярыны Цішкевіч, які адлюстроўвае даволі сур’ёзныя тэмы. Я сумнявалася, што ён выкліча адпаведную рэакцыю, але ўсё ж рызыкнула — і не памылілася. Насельнікі інтэрнату вельмі ганарыліся тым, што ім паказваюць такое мастацтва. Як сказаў адзін з іх, мы перажываем тое самае, што аўтаркі. І паралелі паміж сваёй хваробай і ўбачаным на палатне вельмі істотныя. Чалавек разумее, што нехта “здаровы” адчувае тое самае: адзіноту, страх, боль (а для жыхароў інтэрнатаў такія пачуцці, на жаль, натуральныя), і момант гэтай еднасці прыносіць тэрапеўтычны эфект. Таму я ўжо не сумняюся, што ў нас можна дэманстраваць цяжкія для ўспрыняцця работы, якія выклікаюць не толькі пазітыўныя эмоцыі.

— Вы актыўна папулярызуеце творчасць аднаго з насельнікаў інтэрната — Міхаіла Буліча. Яго жывапіс здзіўляе нават многіх прафесійных мастакоў. Няўжо ён нідзе не вучыўся маляванню?

— Што вы, Міша ўсё жыццё правёў у інтэрнаце. Яму і не трэба было вучыцца — ён увесь час быў такім, якім ёсць, а каб атрымаць шыкоўныя работы, дастаткова проста падсунуць яму паперу большага фармату. Цяпер вось некаторыя рэчы будуць выстаўляцца на “Восеньскім салоне з “Белгазпрамбанкам”.

— А наколькі важны для яго поспех у гледача?

— Прыемны, але, напэўна, не надта важны. Ён малюе таму, што проста не здатны не маляваць. Міша можа папрасіць у цябе толькі дзве рэчы: паперу і гарбату, больш яму нічога не патрэбна. Ніколі не ставіла яго перад выбарам, але, думаю, ён бы хутчэй выбраў паперу.

— Бачачы людзей “з асаблівасцямі”, адчуваеш перасцярогу: як з імі трэба сябе паводзіць, каб не нашкодзіць?

— Паводле майго досведу, адзіная верная камунікатыўная палітыка — гэта як з роўным, як са звычайным чалавекам.

— Адпаведна, не варта хвалявацца, што ты іх неяк пакрыўдзіш?

— Варта — але толькі ў той самай меры, як і ў адносінах да ўсіх людзей. Калі ў твайго калегі па працы вялікі нос, і ён, напэўна, з гэтай нагоды камплексуе, ты не будзеш кпіць і тактоўна прамаўчыш пра асаблівасці ягонай знешнасці. Альбо, калі гэта блізкі сябра, нязлосна пасмяешся: ага, дарагі Сірано! У выпадку з людзьмі, якія маюць псіхічныя захворванні — усё тое самае. Паверце, гэта звычайныя людзі, якія, па вялікім рахунку, мала ад нас адрозніваюцца. Самае галоўнае — імкнуцца спазнаць іх бліжэй. І мастацтва дае для гэтага выдатную магчымасць.

— Наколькі я разумею, насельнікам інтэрната стасункі патрэбныя куды болей, чым нейкая матэрыяльная дапамога?

— Для шчасця чалавеку найперш патрэбны іншы чалавек. Тое, што цябе ўбачаць і пачуюць — куды больш істотна за любыя падарункі.

К

Здабыткі і страты

Куды перацякае творчы імпэт?

Прыблізна ў той час, калі ў нашай Акадэміі мастацтваў праходзіла абарона дыпломаў на факультэтах, якія рыхтуюць прафесіяналаў у сферы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайну, я гутарыў з маскоўскай мастачкай, якая ладзіла сваю выставу ў Мінску. Маю суразмоўцу можна лічыць паспяховым творцам. Яна скончыла адну з самых знакамітых мастацкіх ВНУ былога Савецкага Саюза і сённяшняй Расіі, працуе паводле спецыяльнасці — выкладае выяўленчае мастацтва, мае час на ўласную творчасць, бярэ ўдзел у выставах і пленэрах як дома, так і ў замежжы. Але, што ні кажы, адным з галоўных крытэрыяў поспеху і падстаў для самапавагі яна лічыць грошы.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Я не маю схільнасці лічыць рублі / юані / долары / быры / кванзы ў чужой кішэні, аднак не ўтрымаўся ад пытання, ці адпавядае заробак расійскай мастачкі ўзроўню яе кваліфікацыі? На гэта яна адказала, што сёння ў расійскіх ВНУ культуры і мастацтва конкурс меншы за той, які заспела яна сама. Статус мастака сёння не такі прэстыжны і прывабны, як быў, скажам, за савецкім часам. А прыёмная камісія той ВНУ, якую колісь скончыла яна, наўпрост папярэджвае абітурыентаў, што занятак выяўленчым мастацтвам — справа рызыкоўная і па вызначэнні не прыбытковая. Маўляў, калі ты не гатовы на пэўныя ахвяры дзеля творчага самасцвярджэння, дык лепей не марнаваць час. Сёння ў Расіі, па яе словах, больш запатрабаваны дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Падобна на тое, што аналагічную карціну мы маем і ў сябе, у нашай сістэме падрыхтоўкі творчых кадраў. Я маю на ўвазе сферу выяўленчага мастацтва, дызайну, мастацтва дэкаратыўна-прыкладнога. У эканоміцы неадменна дзейнічае закон перацякання капіталу. У яго аснове тая акалічнасць, што грошы не працуюць пад прымусам, і якімі бар'ерамі і рагаткамі іх ні абкладай, капітал усё адно апынецца не там, дзе яму быць загадана, а там, дзе абяцаецца большы прыбытак. І гэта правільна не толькі ў дачыненні да фінансаў, але, бадай, і да ўсяго спектру чалавечай дзейнасці. Па той жа схеме рэалізуецца і творчы патэнцыял, і капітал інтэлектуальны. Ёсць фанаты сваёй справы, якія гатовыя працаваць дзеля ідэі, але не яны, як прынята казаць, робяць надвор'е. Калі традыцыйныя формы выяўленчага мастацтва запатрабаваны грамадою не ў такой ступені, як гэтага хацелася б выпускнікам мастацкіх ВНУ, амбітная моладзь знойдзе іншую сферу для ўкладання свайго інтэлекту і творчага імпэту.

Вось і на сёлетняй абароне дыпломаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў дызайнеры шэрагу спецыялізацый глядзеліся больш крэатыўна за выпускнікоў мастацкага факультэта. Я не хачу нікога пакрыўдзіць, не збіраюся ставіць пад сумнеў нечы прафесіяналізм і талент. Але ў работах студэнтаў мастацкага факультэта пры адпаведным Акадэміі ўзроўню прафесіяналізму адсутнічала тое, што робіць работу творам — сацыяльная значнасць. Не было скульптур, якія можна было б паставіць на плошчы; карцін, якім месца ў інтэр'ерах грамадскіх будынкаў — каб бачыла як мага болей народу; графікі, вартай тысячных накладаў. А вось у дызайнераў дыпломныя праекты датычылі важных для грамады тэм і з'яў.



Фрагменты дыпломаў 2017 года кафедры гісторыі і тэорыі дызайна "Крыніца мудрасці".

Да прыкладу, вартымі далейшай распрацоўкі дзеля рэалізацыі ў форме нейкага сацыяльна-культурнага праекта падаліся мне два дыпломы — "Мастацкая канцэпцыя выдуманага свету па матывах творчасці Язэпа Драздовіча" і анімацыйны ролік "Язэп Драздовіч: ад Зямлі да Неба". У іх аснове — курсавыя работы. Цэлы курс на працягу семестра працаваў над асэнсаваннем жыцця і творчасці "Вечнага вандроўніка", а дзве самыя ўдалыя работы трансфармаваліся ў дыпломныя. Я згадваю пра тое яшчэ і таму, што штуршок гэтай тэме ў свой час дала наша газета, надрукаваўшы нататкі з прапановаю пабудаваць беларускі "дысней-лэнд" на аснове вобразаў Язэпа Драздовіча. Згаданыя распрацоўкі, як мне падаецца, маглі бы легчы ў аснову канцэпцыі такога патрэбнага краіне культурнага аб'екта.

Некалькі дыпломаў у дызайнераў прысвячаліся 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Была прадстаўлена на абарону работа, дзе асэнсоўваліся працэсы ўзаемадзеяння розных этнасаў і культур у кантэксце беларускай нацыі. Ды і ўвогуле — ужо далёка не першы год на абаронах дызайнераў абавязкова сустракаюцца праекты, якія прапагандуюць нашу культурна-гістарычную спадчыну.

Зразумела, студэнцкія, нават дыпломныя, работы — гэта не тое, што творы сталага майстра. Але ж памкненне маладых прафесіяналаў сказаць болей, чым таго патрабуе дыпломнае заданне, вартае ўхвалення. Гэта я бачыў сёлета ў дызайнераў. Гэтага не адчуў у выпускнікоў мастацкага факультэта.

Каб рабіць грунтоўныя высновы і сур'ёзны прагноз, недастаткова маіх суб'ектыўных меркаванняў. Хтосьці скажа, што я памыляюся — і добра, каб ён меў рацыю. І ўсё ж ёсць пэўныя падставы лічыць, што мы назіраем працэс пераходу творчай энергіі з адной сферы ў іншую, больш перспектыўную. Вынікам можа стаць маргіналізацыя традыцыйнага выяўленчага мастацтва, страта школы жывапісу, графікі, скульптуры.

Калі так, дык гэта падстава для занепакоенасці. Беларусь мае выдатную мастацкую школу, прадстаўнікі якой славутыя не толькі адметным стылем, але і актыўнай сацыяльнай пазіцыяй, здольнасцю наладзіць дыялог з гледачом, сказаць пра набалелае, важнае для грамады ў эстэтычна выразнай і зразумелай шырокай аўдыторыі форме. Будзе крыўдна, калі на такім грунце нічога не вырасце…

Можна сказаць, што сацыяльнае надвор'е не спрыяе. Грамадзе сёння больш патрэбны дызайн, які забяспечвае побытавы камфорт, а не мастацтва, што вярэдзіць розум. І гэтая акалічнасць улічваецца пры размеркаванні грошай на культурныя праекты. Можа, мае рацыю мая маскоўская суразмоўца і прыёмныя камісіі расійскіх творчых ВНУ, якія папярэджваюць абітурыента пра непрыбытковасць прафесіі мастака?



Сёлета Дзяржаўнай камісіяй як надзвычай цікавы быў адзначаны дыплом кафедры касцюма і тэкстылю, прысвечаны беларускаму фальклору і нашай дахрысціянскай культуры — шэраг сцэнічных касцюмаў, што ўвасабляў персаніфікаваныя вобразы стыхій, якім пакланяліся нашы продкі. Гэта мастацкая прапанова новага прачытання ранняй гісторыі нашай зямлі, незамулены погляд на Космас нашых прашчураў.

Карацей кажучы, дызайнеры актыўна спрычыніліся да патрэбнай для дзяржавы і грамадства справы — стварэння базавых чыннікаў нацыянальнай тоеснасці.

Нават калі прымаць як дадзенасць тое, што дызайн бярэ на сябе сацыяльныя функцыі, якія звыкла лічацца прэрагатываю выяўленчага мастацтва, нельга пагадзіцца з тым, што ідэйны і ідэалагічны змест выяўляецца ў жывапісе, графіцы, скульптуры не так выразна, як, напрыклад, за савецкім часам. Надта ж не хочацца пераносіць на мастацтва эканамічныя законы.

К

З Днём настаўніка!

Калі згубіліся акуляры рамантызму

Выстава, якая неўзабаве адкрыецца ў галерэі "Універсітэт культуры", называецца "Адлюстраванне часу". Такая назва ад пачатку падалася мне банальнай, але, калі ўдумацца, можна ўсвядоміць яе глыбіню. Тым больш, гэтым разам будуць выстаўлены не толькі мае творы, але і працы маіх вучняў — студэнтаў-архітэктараў з БНТУ, дзе я выкладаю ўжо болей за дзесяць гадоў. Адпаведна, чым не нагода паразважаць пра пераемнасць пакаленняў у мастацтве, пра настаўніцтва і вучнёўства?

Мой узрост абумоўлівае сталае бачанне часу, калі акуляры рамантызму ўжо даўно паспелі згубіцца. Зрэшты, міжволі адзначаю, што і студэнты становяцца ўсё больш прагматычнымі, рацыянальнымі. Яны ведаюць, навошта робяць той ці іншы твор, грэбуюць марнатраўствам, лічаць кошт фарбаў ці маркераў…

Тыя студэнты, творы якіх будуць дэманстравацца на гэтай выставе, усведамляюць адметнасць свайго ўмення, майстэрства, таленту. Гэта іх адлюстраванне часу. Іх позірк, іх матывацыя, іх інтэлект, іх жыццёвы досвед (хай сабе, яшчэ і не надта змястоўны), іх майстэрства… А таксама і адказнасць. Бо адна справа — сустрэча з гледачом у бібліятэцы ці ў памяшканнях універсітэта, а зусім іншая — гэта ўзровень рэспубліканскага маштабу, які прапанавала галерэя на цэнтральнай плошчы сталіцы.

Такую самую адказнасць адчуваў і я — у якасці ўжо не педагога, але мастака. Толькі сёлета мне пашчасціла мець дзве важныя для мяне выставы: "Пчалінае ўзнясенне" ў Чырвоным касцёле і "Песня дрыгвы" ў Палацы мастацтваў. Паўтораў ні ў якім разе не хацелася, таму я вырашыў прапанаваць праект, створаны з кампазіцыйных партрэтаў маіх улюбёных герояў, які два гады таму быў распачаты з выставы "Пагоня на Грунвальд" і сам сабою прасіўся на працяг.

Што ж такое быць настаўнікам для мастака? Гэта можна адчуць толькі з уласнага досведу. Калі ты вандруеш па Беларусі сам — прасякаешся асабістымі эмоцыямі, адчуваеш унутраную цішыню. Калі разам з табой твае студэнты, "гучнасць" ужо зусім іншая.

Я паэтычна і ўзнёсла магу распавядаць ім пра Валожыншчыну, Капыльшчыну, Ваўкавышчыну і гэтак далей, але "чапляюць" мае аповеды кожнага па-свойму, у залежнасці ад яго ўнутранага свету. І, магчыма, краявіды, якія мы бачым вакол Міра ці Савічаў, адкрываюць ім вочы на родныя мясціны, адкуль пачынаўся іх род. Або, прынамсі, спараджаюць успаміны.

Патрабаванні да настаўніка, лічу, вельмі простыя: кантактнасць і добразычлівасць, дасведчанасць і фантазія, пошук і творчасць. А таксама ўменне тактоўна накіроўваць свайго вучня на дасягненне належнага выніку.

"Здзіўленне прыгожым — гэта і ёсць пачатак. Ад здзіўлення думка імкнецца да ўражанняў…" — так не раз казаў мой настаўнік, легендарны Сяргей Пятровіч Каткоў. Яго дзень нараджэння 1 кастрычніка — акурат за дзень да адкрыцця нашай сёлетняй выставы. Гэта да яго прывяла мяне мама ў пяць маіх гадочкаў у Рэспубліканскі палац піянераў. Потым была вучоба ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве, да стварэння якой Каткоў таксама не абы-як спрычыніўся.

Так што гэтая выстава — своеасаблівы ланцужок пераемнасці пакаленняў. З Днём настаўніка, сябры!

Алесь КВЯТКОЎСКІ,
мастак, старшы выкладчык архітэктурнага факультэта БНТУ

“Не варта быць тэатральным МакДональдсам”

Што мы ведаем пра сучасны танец, так званы contemporary dance? Нельга сказаць, што нічога — імёны Піны Баўш, Марыса Бежара, Іржы Кіліана на слыху ў дасведчанай публікі. Аднак ці з’яўляецца сучасны танец прызнанай і натуральнай часткай беларускай танцавальнай сцэны? Сфармуляваць і паразважаць над гэтым пытаннем падштурхнуў візіт у Мінск французскага харэографа Анжэлена ПРЭЛЬЖАКАЖА з Нацыянальнага харэаграфічнага цэнтра Экс-ан-Праванса. Адна з буйных фігур сусветнай танцавальнай сцэны прыехала ў Мінск на форум “Тэарт” — прадставіць адну са сваіх апошніх пастановак “Фрэска. Карціна на сцяне”, а таксама кінастужку “Паліна, станцаваць сваё жыццё”, зробленую сумесна з кінарэжысёрам і сваёй жонкай Валеры Мюлер.

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

Анжэлен Прэльжакаж і Валеры Мюлер. / Фота Таццяны СВІРЭПА

“У маім асабістым топе выбітных харэографаў першыя месцы займаюць тры фігуры, — сустракаю на паказе балета беларускага харэографа Дзмітрыя Залескага, — Іржы Кіліан, Ахада Нахарын, і… Анжэлен Прэльжакаж. Гэта — жывая класіка, і цяжка пераацаніць тое, што Прэльжакаж уласнай персонай прыехаў у нашу краіну”. І сапраўды, калі расійская публіка пазнаёмілася з творчасцю месье Анжэлена напрыканцы XX стагоддзя (яго балет “Парк” паказалі ў Маскве на сцэне Вялікага ў 2011-м, пастаноўка харэографа Creation-2010 адкрывала сезон у 2010-м), то для нашай публікі яго выхад, лічы, прэм’ерны.

Французскі балетмайстар вядомы сваёй прыхільнасцю да “Рускіх сезонаў” і неаднаразова звяртаўся да спадчыны балетаў кампаніі Дзягілева. Аднак у нашым выпадку маэстра прывёз сваю апошнюю працу “Фрэска. Карціна на сцяне”, заснаваную на старадаўняй кітайскай казцы, і, па словах аўтара, прызначаную далучыць маладую (ды не толькі) аўдыторыю да сучаснага танца.

Адзін з буйных харэографаў сучаснасці, спектаклі якога ўвайшлі ў рэпертуар вядучых тэатраў свету — “Ла Скала”, “Нью-Ёрк сіці балет”, Парыжская опера, “Марыінскі тэатр” — ахвотна пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў аглядальніка “К”.

— Месье Анжэлен, вашы ўніверсітэты ўключаюць і школу харэографа Мерса Канінгема ў Нью-Ёрку. Вядома, што Канінгем — пастаянны творчы партнёр кампазітара-авангардыста Джона Кейджа — выкарыстоўваў у пабудове танца “выпадковы метад”, алеаторнасць, парушаў стэрэатыпы тагачаснай танцавальнай традыцыі… Чым для вас былі каштоўныя тыя ўрокі ?

— Канешне, гэты час быў для мяне вельмі карысным. Не толькі з тэхнічнага боку. Менавіта дзякуючы Канінгему я зразумеў, якой можа быць эстэтычная канцэпцыя танца. У яго школе я прыйшоў да высновы, што хачу пайсці сваім шляхам і займацца ўласнай харэаграфіяй.

— Ці гэта праўда, што менавіта Рудольф Нурыеў запрасіў вас да супрацоўніцтва ў Парыжскую оперу?

— Так, праўда. Ён убачыў мой балет “Вяселейка” на музыку Стравінскага і прапанаваў зрабіць якую-небудзь пастаноўку для Парыжскай оперы. Спачатку мы проста абмяркоўвалі магчымыя варыянты, а потым з’явіўся такі балет, як “Парк”, і тэатру ён прыйшоўся даспадобы.

— …І ажно да гэтай пары ідзе на сцэне розных тэатраў, у прыватнасці, Марыінскага, ды лічыцца адным з самых вытанчаных вашых балетаў. Але “Вяселейка” — не адзіная ваша пастаноўка, дзе вы звяртаецеся да спадчыны Ніжынскіх і Стравінскага. Вялікі выбух і шмат дыскусій спарадзіла “Вясна свяшчэнная” ў вашай трактоўцы, дзе галоўная гераіня лібрэта Рэрыха — Выбранніца — з’яўляецца на сцэне аголенай…

— Так. Аднак мой ход — паказаць Выбранніцу аголенай — гэта своеасаблівы сімвал. Я хацеў падкрэсліць неабароненасць гераіні падчас прысвячэння, а потым — выявіць, як дзяўчына праз сваё перажыванне набывае сілу. Не трэба чытаць гэты вобраз прама.

Ведаеце, ёсць культура вуду, калі падчас рытуалу яго ўдзельнікі пагружаюцца ў транс. Штосьці падобнае адбываецца і ў маёй версіі “Вясны свяшчэннай”, калі Выбранніца цалкам агаляецца. Яе цела мусіць выклікаць стан трансу, уласцівы сапраўдным рытуалам. Вось што мелася на ўвазе.

— “Вясна свяшчэнная” ў пастаноўцы Ніжынскага сталася прадказаннем вялікіх катастроф, якія напаткалі свет у XX стагоддзі… Вам не было страшна брацца за такі няпросты матэрыял?

— Вядома, страшна. Але страх часам з’яўляецца добрым стымулам, каб выявіць штосьці сваё. Згодны, што ў “Вясне…” святло і дар Ніжынскага выяўляюцца асабліва, але я імкнуўся паставіць гэты знакаміты балет ужо ў прасторы нашага часу. Тое, што ён выклікаў столькі дыскусій, лічу яго вартасцю.

— Як вам падаецца, дзе паляга мяжа паміж прыватным і публічным у харэаграфіі?

— Для мяне менавіта творчасць і здольная парушыць тую мембрану, якая падзяляе гледача і дзеянне на сцэне. Харэаграфічная пастаноўка — надзвычай далікатная рэч. І ў ёй вельмі важна перайсці мяжу адчужанасці ды стварыць сітуацыю, калі глядач, знаходзячыся, скажам так, у сваім целе і свядомасці, пачынае адчуваць трапную неверагоднасць і прыгажосць танца. Калі, назіраючы за танцам, ён можа сабе сказаць: я разумею, пра што ідзе гаворка. Выступленні палітыкаў не здольныя пераадолець гэтую мембрану адасобленасці, бо іх прамовы разлічаны на ўсю аўдыторыю адразу. А мастацтва, творчасць, якія звяртаюцца да кожнага з нас паасобку, толькі і здатныя перасекчы мяжу паміж публічным і прыватным.

— Магу заўважыць, што вашы вядомыя пастаноўкі — гэта не толькі вытанчаны экспрэсіўны танец, але і заўжды відовішча. У “Рамэа і Джульеце” вы супрацоўнічалі з мастаком, аўтарам коміксаў Энкі Білелем, у “Беласнежцы” — з мадэльерам Жанам-Полем Гацье… У фільме “Паркетчыкі”, які рабілі сумесна з Сірылам Коларам, ажыўлялі аднайменную карціну Гюстава Кайбота. Відавочна, што відовішчнасць мае для вас значэнне…

— Так, вы маеце рацыю. З гэтай нагоды я магу сказаць наступнае. Важнай рысай нашых спектакляў з’яўляецца тое, што мы іх робім тут і цяпер. Гэта не карціна, якой мы будзем захапляцца і праз стагоддзі. Палатно нерухомае і цэльнае, а ў танцы ўсё, што ў нас ёсць — гэта цяперашні момант, у які важна патрапіць і гледачу і артыстам. Дзеля таго, каб гэты дыялог узнік, і неабходна чымсьці зачапіць публіку. Тут на дапамогу акурат і прыходзіць відовішчнасць, якая, выконваючы ролю той самай “зачэпкі”, дазваляе потым гледачу з паверхні знакаў перайсці на больш глыбінны ўзровень. Я прапаную яму далей пашырыць сваё бачанне, зазірнуць у свой уласны свет, адысці ад умоўнасцей і раскрыць штосьці ў сабе самім. Відовішчнасць для мяне — усяго толькі “зачэпка”, якая дае магчымасць дакрануцца да душы чалавека. Не варта быць тэатральным “МакДональдсам”, які не пакідае след у свядомасці чалавека.

— Дзякуй за адказ. Учора на паказе вашай сумеснай з Валеры Мюлер стужкі “Паліна, станцаваць сваё жыццё”, вы сказалі, што класічны танец для вас — гэта “наш музей танца, у які мы прыходзім натхняцца. Але ў той самы час неабходна і ствараць класіку сучаснага дня, гэта тое, чым мы займаемся сёння”. Ці адчуваеце вы, што пазіцыі contemporary dance цяпер самыя моцныя ў свеце?

— Разважаючы ўчора пра класічны балет, я хацеў падкрэсліць, што класічны танец быў сучасным раней. А сёння проста патрабуецца яго новае асэнсаванне. Як, у прынцыпе, усяго, што адбываецца ў мастацтве. Мы ведаем пра сюжэты, якія паўтараюцца. Да прыкладу, сюжэт Дабравешчання ў розныя часы пісалі і Рубенс, і Далі, і кожны з іх браў штосьці ад мастацтва сваёй эпохі і дадаваў уласнае бачанне. Так і знакамітыя харэографы — Марыс Бежар, Мерс Канінгем ды іншыя, спалучаючы класіку і сучаснасць, зрушылі танец наперад. Яны балансавалі на мяжы старога і новага, робячы крок за крокам у гісторыі танца. Гэта важна — умець карыстацца тым, што ёсць, але адначасова ажыўляць назапашанае, убіраючы ў танец павевы сучаснасці. Спадзяюся, новыя пакаленні будуць лічыць тое, што мы робім, класікай!

— Наколькі перадавая сёння французская танцавальная сцэна?

— Складна сказаць. Мне падаецца, што гэты цэнтр авангарда пастаянна перасоўваецца. Напрыклад, у 1970-я гады ім можна было назваць Нью-Ёрк, затым ён пасунуўся ў Францыю. Сёння, мяркую, тут, у вас, працуюць харэографы і пастаноўшчыкі, якіх у поўнай меры можна назваць прадстаўнікамі авангардызму. Галоўнае, даць ім магчымасць заявіць пра сябе. Авангард можа выбухнуць у любым месцы.

К

Дарэчы

Анжэлен Прэльжакаж правёў для беларускіх танцораў кастынг у межах форуму “Тэарт”. Для сваёй новай пастаноўкі ён шукае двух артыстаў. “Вашы танцоры знаходзяцца ў выдатнай форме: як у тэхнічным плане, так і ў артыстычным, — пахваліў ён у гутарцы з аглядальнікам “К” узровень беларускіх артыстаў. — Я вельмі задаволены. Аднак пакуль з аб’яўленнем вынікаў не спяшаюся. Для таго, каб запрасіць кагосьці ў Францыю, я мушу быць упэўненым, што гэты чалавек здолее потым са мной працаваць. І такая перспектыва можа быць нялёгкай для саміх танцораў. Пакуль яшчэ думаю, каму магу зрабіць прапанову. Агучу рашэнне, відаць, напрыканцы лістапада”.

Чатыры цытаты ад Анжэлена Прэльжакажа і Валеры Мюлер

Запісаныя падчас размовы з гледачамі пасля паказу кінастужкі “Паліна, станцаваць сваё жыццё” ў сталічным кінатэатры “Масква”

Валеры: — У нашым фільме выкарыстоўваецца шмат буйных планаў, але гэта невыпадкова. Я не танцоўшчыца, аднак ёсць тое, што аб’ядноўвае нас усіх — гэта наша цела. Мы можам ім валодаць да такой ступені, каб з яго дапамогай перадаваць іншым свае пачуцці. Вось тое, што было для нас важна ў нашай гераіні. Каб Паліна магла выявіць свой стан не дыялогамі, не словам, а рухамі, танцам, перажываннямі. Таму для нас і былі істотныя буйныя планы. І тая ўсмешка, якая ўзнікае напрыканцы стужкі, сімвалічная. Бо яна — таксама частка танца.

Анжэлен: — Што значыць танцаваць для мяне? Давайце перафразуем пытанне. Што такое цела? Што такое я? Калі я кажу “я”, гэта маё цела ці штосьці большае? Я выкарыстоўваю сваё цела для чагосьці, або маё цела выкарыстоўвае мяне? Гэта складаныя ўзаемадачыненні, і перш за ўсё неабходна зразумець, дзе “я”, а дзе “маё цела”. На маю думку, менавіта калі чалавек танцуе, гэтыя сумненні рассыпаюцца. Узнікае момант, калі “я” і “цела” зліваюцца ў адно. Мне падаецца, што танец — гэта той момант, калі цела і душа злучаюцца. Так, для мяне танец — гэта штосьці вельмі духоўнае.

Валеры: — Для нас вельмі істотны момант трансфармацыі Паліны як танцора. Яна пачынае вывучаць харэаграфію ў балетнай школе, але затым, калі лёс выкідае яе, лічы, на вуліцу, кардынальна мяняе сваё ўяўленне пра танец. Яна пачынае бачыць яго ў сваім атачэнні, у паўсядзённым жыцці. І апошні танец, дуэт, якім заканчваецца карціна — гэта кульмінацыя яе трансфармацыі як танцора. Бо ў гэтым нумары спалучаюцца і жорсткасць, упартасць балетнага навучання, і тая змена, якая адбылася з Палінай за час, калі яна ўбачыла танец з іншага боку. Працэс руйнавання і стварэння ў артысце — вось што вянчае гэты дуэт.

Анжэлен: — Лічу, што мы павінны навучыцца па-новаму глядзець на сваё цела, па-новаму яго адчуваць. Нельга да цела ставіцца толькі як да інструмента вытворчасці ці атрымання задавальнення. Наша цела — гэта тэрыторыя, цэлая прастора, якую можна паказаць з дапамогай танца. У сучасным свеце, дзе столькі гвалту і войнаў, цела мусіць адчувацца намі зусім па-іншаму — мы павінны яго разумець і чуць. Тады і дасягнеш гармоніі з самім сабой. Я хацеў бы ў гэтым кантэксце працытаваць Фрыдрыха Ніцшэ: “Я здолею паверыць толькі ў таго Бога, які будзе ўмець танцаваць”.

Сярод невылечных хвароб, якія чалавецтва прыдбала разам з цывілізацыяй — бібліяманія. Гэтая жарсць да кніг мае распаўсюд сярод культурных класаў, але пры эпідэміі можа ахапіць і маргінальныя групы грамадства. Як было за савецкім часам, калі паліца з поўным зборам якога-небудзь — няважна якога — класіка лічылася абавязковай аздобай хатняга інтэр'еру.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Шрыфт як код ідэнтычнасці

Жыццё бібліямана цяжкае. Кніжная жарсць з'ядае ягоны заробак. Ён знаходзіцца ў бясконцым пошуку рарытэтаў і ў перманентным канфлікце з сям'ёю, бо блізкіх нервуе тое, што кнігі, размнажаючыся, запаўняюць усю прастору жытла і выціскаюць людзей. Цікава, што бібліяман можа тыя кнігі і не чытаць. Каб занурыцца ў транс і выйсці ў астрал, яму дастаткова лашчыць вокам вокладкі. Бібліяман з аднаго позірку вызначае каштоўнасць кнігі, а па шрыфце, якім яна набраная, назаве краіну, дзе яна выдадзена, і прыблізны год выдання. Так што выстава "ЛітАрт 2017", дзе экспануюцца ўзоры мастацтва шрыфта, найперш для бібліяманаў. Але яна цікавая і нармальнаму чалавеку.

Мастакі, што працуюць у гэтай галіне, таксама людзі асаблівыя. Калі ты не фанат літары, дык доўга тут не затрымаешся. Сучасныя алфавіты склаліся стагоддзі назад, тады ж акрэсліліся і графемы (схемы, выяўленчыя канструкцыі) кожнай з літар. І трэба мець талент і асаблівы склад мыслення, каб па-новаму намаляваць усім даўно знаёмае. Беларускаму кнігадрукаванню 500 гадоў. І ўжо гэтая акалічнасць, здавалася б, дае нам права гаварыць пра глыбокія карані і, адпаведна, моцныя традыцыі беларускай шрыфтавой культуры. Але ў рэчаіснасці быў досыць доўгі перыяд перапынку нацыянальнай традыцыі, якая колісь паўстала на еўрапейскай цывілізацыйнай глебе. Пра тое, што краіне трэба свой адрозны ад суседзяў шрыфт, які быў бы знакам нашай тоеснасці ў сусветнай інфармацыйнай прасторы, загаварылі адносна нядаўна. Ды і спантанныя пошукі ў гэтым напрамку маюць нядоўгую гісторыю. Хіба два дзесяцігоддзі…

Канстанцін Вашчанка. "V".



Уладзімір Васюк. "Укрыжаваная літара".

Выстава, пра якую ідзе гаворка, не столькі падводзіць вынікі нейкага перыяду ў развіцці беларускага шрыфтавога мастацтва, як дэкларуе напрамак пошука. Пасля яе прагляду не застаецца сумневу, што беларускі нацыянальны шрыфт мусіць мець у аснове спадчыну Францыска Скарыны, распрацаваныя Палачанінам эстэтычныя і функцыянальныя прынцыпы. У гэтым мяне пераконваюць творы Паўла Семчанкі, Генадзя Мацура і Усевалада Свентахоўскага (дарэчы, гэты майстар не толькі ўдзельнічае ў "ЛітАрце", але адначасова ладзіць персанальную выставу ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі). Мяне вельмі ўразілі плакаты Свентахоўскага, прысвечаныя асобам, якія прычыніліся да Скарынавай справы. Многія дагэтуль лічаць, што ўсю працу па Бібліі першадрукар рабіў сам. Між тым, узняць такую глыбу аднаму, без памагатых, проста немагчыма. І Скарына быў найперш геніяльным менеджарам, які здолеў аб'яднаць у грандыёзным праекце высакакласных спецыялістаў. Гэтых асоб і згадвае ў плакатнай серыі спадар Усевалад.

На афішы "ЛітАрту" пазначана "Скарынавы фэст". Гэта ўдакладненне раскрывае канцэпцыю выставы. Значная частка твораў прысвечана непасрэдна Палачаніну і ягонаму часу, а іншыя — рэаліям сучаснай эстэтыкі, якая наўпрост ці ўскосна знітавана са Скарынавай традыцыяй. Недзе гэтая знітаванасць выяўлена ў запазычанасці гістарычных форм і адпаведнай стылістыцы, а недзе — у пераемнасці прынцыпаў Скарынавага наватарства і ўласцівай нашаму генію парадаксальнасці мыслення.

Таццяна Кулажанка. "Азбуква".

Уладзімір Цэслер. "Вулічны ўказальнік".

Юрый Тарэеў. Аркуш з нізкі "Па-свойму".

Уражваюць распрацоўкі шрыфтавых гарнітур Дзяніса Серабракова, вобразныя кампазіцыі Вячаслава Паўлаўца, Уладзіміра Васюка, Сяргея Саркісава, Юрыя Тарэева. Распрацаваныя Таццянай Кулажанка "Азбуква" і шрыфт Андрэя Савіча "Ланцуг" на першы погляд успрымаюцца як нешта не надта сур'ёзнае, як інструментарый нейкай гульні ў словы і сэнсы для дарослых дзяцей. Але пры жаданні тут можна знайсці і своеасаблівую філасофію. Так сакральнае ператвараецца ў жартоўнае, а знакі, задуманыя для візуалізацыі глыбокіх думак — у аздобу рэкламнай улёткі.

Нечакана, але вельмі дарэчы, глядзіцца ў экспазіцыі вулічны ўказальнік работы Уладзіміра Цэслера "праспект Францыска Незалежнага". На першы погляд — мастацкі "прыкол", якія ў Цэслера атрымліваюцца надзвычай удала. А насамрэч ён мае глыбокую думку. Незалежнасць дзяржавы ўсё ж такі мае ў падмурку суверэнітэт духоўны. Змяняцца могуць межы, але не маральны стрыжань нацыі. Для нас гэта — Скарынава Біблія.

К

Прывабныя твары сяброў...

Літаратары ў майстэрні Георгія Паплаўскага.

Зазірнуўшы днямі ў Сеціва, каб знайсці адрас адной з мінскіх мастацкіх галерэй, я быў прыемна ўражаны дынамікай развіцця галерэйнай справы ў нашай сталіцы. Па аналогіі згадалася памежжа 1980-х — 1990-х, калі, бадай, кожная ўстанова, што дбала пра свой імідж, імкнулася мець мастацкую калекцыю ці хаця б прастору, прыстасаваную для правядзення выстаў ці іншых культурных акцый. Потым ці то грошы скончыліся, ці то грамада ад мастацтва адхінулася, але пасля ўздыму ў гэтай галіне, як і мае быць паводле логікі ківача, надышоў спад. І вось зноў... Чарговай праявай культурнай экспансіі ў гарадскую прастору стала з'яўленне на праспекце Незалежнасці галерэі-кавярні "Арцель".

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Каб трапіць у "Арцель", трэба прайсці паміж дамамі нумар 58 і 60 углыб двара. Мяркуючы па архітэктуры, будынак раней меў тэхнічнае прызначэнне, з'яўляючыся часткай комплексу прамысловых пабудоў, што зараз паступова перарабляюцца пад іншыя, больш адпаведныя цэнтру сталіцы функцыі. Існуе тая "Арцель" з мая. Першыя выставы тут адбыліся ўлетку. Тутэйшыя мастацкія праекты наўрад ці можна лічыць камерцыйнымі, бо за прагляд выстаў грошай не бяруць. Хаця, магчыма, эканамічны сэнс тут прысутнічае. Наяўнасць пры кавярні выставачнай прасторы дае ёй перавагі перад іншымі прадпрыемствамі грамадскага харчавання. Робіць яе больш прывабнай, а значыць, і больш прыбытковай.

Тое, што ўздоўж цэнтральнай магістралі сталіцы, якая фактычна з'яўляецца галоўнай турыстычнай славутасцю Мінска, паўстаюць не толькі офісы, крамы і бізнес-цэнтры, але і культурныя аб'екты — тэндэнцыя, вартая падтрымкі гарадскіх улад. Тым больш, калі гаворка ідзе пра адрэзак праспекта паміж ЦУМам і Акадэміяй навук, які адносна нядаўна лічыўся перыферыяй цэнтра. За кошт наяўнасці ў згаданым квартале рознастылёвай, збольшага не надта самавітай забудовы (колішнія заводскія цэхі і архітэктурна невыразнае жытло) ён вонкава выпадае з парадна-ўрачыстага праспекта Незалежнасці. Як у перспектыве давесці да ладу квартал, надаць яму рэспекту, думаць архітэктарам. Але напоўніць ягоную безаблічную, дэпрэсіўную забудову культурнымі чыннікамі, надаць яму крэатыву можна і трэба ўжо зараз.

На гэтым тыдні ў "Арцелі" адкрылася персанальная выстава вядомага фотамайстра, фотажурналіста Яўгена Коктыша. Творцы, чые работы не сорамна выставіць хоць у Нацыянальным мастацкім, хоць у Нацыянальным гістарычным музеі. Хоць у Маскве, хоць у Парыжы. У "Арцелі" выстава займае дзве невялікія залы, якія сваім маштабам пасуюць экспазіцыі, разлічанай на ўдумлівага гледача. У якасці назвы аўтар абраў паэтычны радок Бэлы Ахмадулінай "Друзей моих прекрасные черты…" На ёй сапраўды прадстаўлены партрэты асобаў, з якімі спадар Яўген блізка знаёмы, якіх шануе як сяброў і аднадумцаў. Гэта людзі культуры і мастацтва. Фотахроніку іх жыцця і творчасці ён вядзе не адно дзесяцігоддзе. Паколькі ўсе мы ходзім пад Богам і аднойчы выпраўляемся да яго, некаторыя асобы глядзяць на нас з гэтых фатаграфій нібыта з Вечнасці… Асаблівую каштоўнасць фотаздымкам надае тая акалічнасць, што яны не пастановачныя. Гэта не выбудаваныя кампазіцыі, але злоўленыя аб'ектывам майстра імгненні, у якія чалавек найбольш тоесны самому сабе.

Васіль Шаранговіч з дачкой Наталляй.

Рыгор Барадулін і Анатоль Анікейчык.

Культурная гісторыя краіны па версіі Яўгена Коктыша

Фрагмент экспазіцыі.

Некаторыя з тых, чые рысы твару занатаваныя Яўгенам Коктышам у фотапартрэтах, знаёмыя і мне, хоць і не так блізка. Дзіўлюся інтуіцыі майстра, які мае здольнасць апынуцца побач і накіраваць камеру на чалавека менавіта тады, калі яго міміка і пастава дакладна адпавядаюць унутранай сутнасці. Фотапартрэты ахопліваюць час ад 70-х гадоў мінулага стагоддзя да нашых дзён. Калі чалавек дасягае высокага сацыяльнага статуса, ягоны сённяшні стан транслюецца і на ўсё ягонае мінулае. Маўляў, свае таленты ён дэманстраваў яшчэ ў дзяцінстве. А па сведчаннях спадара Яўгена бачна, што знакавыя асобы вырастаюць са звычайных людзей і такімі ж звычайнымі застаюцца паза межамі майстэрні, тэатральнай ці канцэртнай сцэны, здымачнай пляцоўкі кінастудыі.

Немалая колькасць тых, чыё аблічча зафіксаванае Яўгенам Коктышам для гісторыі, прыйшлі на вернісаж. Былі сярод іх і ягоныя калегі па творчым цэху — фотажурналісты. А паколькі людзі гэтай прафесіі ніколі не адпачываюць, і, нават знаходзячыся на свяце, адчуваюць сябе, так бы мовіць, "пры выкананні", усе яны разам са спадаром Яўгенам былі ўзброеныя камерамі і здымалі, здымалі, здымалі…

Падумалася: чаму пры наяўнасці аднолькавага інструментарыя, аднолькавых камер і аб'ектываў у розных аўтараў атрымліваюцца розныя здымкі? Я маю на ўвазе не тэхнічны ўзровень, а мастацкія якасці. А вось і выходзіць, што трымаеш у руках камеру, а здымаеш усё ж такі сэрцам. Яўген Коктыш шануе, любіць сваіх сяброў. І гэта пачуццё нейкім чынам перадаецца аб'ектыву. Таму і назва выставы цалкам адпавядае сутнасці ягонай творчасці.

К

Мірныя сцэны "вайнушкі"

Беларускі дзяржаўны тэатр лялек прымеркаваў да пачатку сезона прэм'еру — Mann ist Mann паводле аднайменнай п'есы Брэхта ("Чалавек ёсць чалавек"), вядомай у нас пад назвай "Што той салдат, што гэты". Спектакль, пастаўлены галоўным рэжысёрам тэатра Аляксеем Ляляўскім, атрымаў жанравае азначэнне "Гульня ў салдацікі, альбо Камедыя пра чалавека, які не змог сказаць "не". Аглядальнікі "К" дзеляцца ўражаннямі.

Бліжэйшы паказ спектакля Mann ist Mann адбудзецца 12 кастрычніка. / Фота Надзеі БУЖАН

А дзе чалавек?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Твор нямецкага драматурга, напісаны ў 1920-я, у рускамоўным перакладзе пачаў ставіцца з 1960-х, пераважна з акцэнтам на антыфашысцкія ідэі. Ішла п'еса і ў нас: старэйшае пакаленне павінна памятаць нашумелы спектакль маладога на той час Валерыя Раеўскага ў Купалаўскім тэатры. Актуальнасць тэксту, звернутага ў п'есе да падзей каланіяльнай палітыкі Брытанскай імперыі ў Індыі, апошнім часам толькі ўзрасла: войны не сышлі ў нябыт, а захопы і перадзел тэрыторый пайшлі на новы віток.

У Брэхта п'еса мае сціплацiслае азначэнне — камедыя. Аднак у сваіх нататках ён пастаянна называе яе прытчай. Сапраўды, пры ўсёй, здавалася б, недарэчнасці і знешне абсурдысцкай смяхотнасці некаторых сітуацый, трагічнага тут значна больш. І выяўлена яно максімальна зразумела — у тым ліку, праз адзін з вершаваных брэхтаўскіх "зонгаў": маўляў, калі захацець, можна цалкам перарабіць чалавека, вымусіць яго адмовіцца ад усяго асабістага і стаць сродкам, "прыдатным для ўсялякай мэты". У цяперашнім спектаклі тыя радкі і са сцэны ў фінале гучаць, і ў праграмцы надрукаваны, каб падрыхтаваць гледача да адпаведнага ўспрымання. Рэжысёр максімальна абыходзіць сцэнічныя жартачкі, пазбаўляецца клаўнады і прыёмаў вулічна-кірмашовага тэатра, што патэнцыйна закладзены ў п'есе. Робіць іншыя скарачэнні, перастаўляе месцамі некаторыя фрагменты — і паслядоўна вядзе гледача ад нязмушанай і бясхрыўднай гульні да сапраўднай трагедыі. Ад дзіцячай ідэалістычнасці — да жорсткай "дарослай" рэальнасці.

У аўтарскіх заўвагах да берлінскай пастаноўкі 1931 года, што была ажыццёўлена самім Брэхтам, падкрэслены чатыры пераўвасабленні: салдата Джэрая Джыпа — у боства, сяржанта Ферчайлда па мянушцы Крывавая пяцярня — у цывільнага, карчмы — у пустое месца, грузчыка Гэлі Гэя — у салдата. У спектаклі Ляляўскага акцэнтуецца апошняе з іх. У тым ліку, праз пластыку: герой Дзмітрыя Чуйкова страчвае пачатковую гнуткасць, уласцівую прафесійнаму танцоўшчыку ці міму. Галоўным для рэжысёра становіцца не пераўвасабленне (яно ляжыць на паверхні), а пераасэнсаванне. І зрабіць яго павінны самі гледачы. На гэту ідэю працуе і выкарыстаная ў пастаноўцы рэпрызнасць. Мірную сямейную сцэну, з якой пачынаецца п'еса, Ляляўскі мяняе месцамі з наступнай ваеннай. Праз гэта відовішчны пралог перагукаецца з фіналам: чацвёра артыстаў-салдатаў (Дзмітрый Рачкоўскі, Цімур Муратаў, Ілья Соцікаў, Валерый Зяленскі — выключны акцёрскі ансамбль) бягуць "сярод дыму і полымя" (у фінале, дзе Гэлі Гэй "адчувае смак крыві", палымянай чырвані, зразумела, больш).

Развенчванне рамантызаванай брутальнасці, што з-за дыму быццам "лунае ў аблоках", пачынаецца адразу, як рассейваецца вэлюм туману. Мастак Людміла Скітовіч апранае артыстаў не ў камуфляжную форму, а ў шэрыя плюшавыя камбінезоны з крыху прыніжанай проймай і капюшонам, што закрываецца на молнію. Ды якія ж гэта салдаты? Хутчэй, гэткія мілыя звяркі з дзіцячага ранішніка, толькі вушак ды хвосцікаў не хапае. Бянтэжыць хіба іх аднолькавасць — пры ўсёй розніцы ў росце і камплекцыі.

Потым з'яўляюцца салдацікі-лялькі — і становіцца зусім весела. Пры ўсёй сваёй рухавасці фігуркі добра стаяць на нагах. Устойліва самастойныя! А прыўзніме артыст у якой з іх галаву — у той быццам рот разяўляецца. Смешна! Замест вайсковых касак — паходныя металічныя кацялкі, прызначаныя для ежы. Новенькія, бліскучыя. Яшчэ дзве такія ж "місы", толькі памерам крыху паболей, носіць у якасці грудзей карчмарка — удава Бегбік (Кацярына Трафімук, якая спявае не горш за прафесійную джазменку). Цацачныя танкі, што некалькі разоў праязджаюць па авансцэне, асацыююцца з моднай камп'ютарнай гульнёй. А колькі іншых вынаходлівых дэталяў! Камлі пальмаў зроблены з тоўстай вяроўкі, наматанай на катушку. Лісце — з яркіх пер'яў, якімі ўпрыгожваюць танцоўшчыц вар'етэ. Такое спалучэнне неспалучальнага не толькі выклікае ўсмешку, але і стварае дадатковыя сэнсы.

Падобная амбівалентнасць уласціва і музыцы лідара гурта "НагУаль" Леаніда Паўлёнка, з якім тэатр супрацоўнічае не ўпершыню. Адна з найчасцей паўтораных у спектаклі музычных тэм нясе адчуванне забаўляльнасці: простая мелодыя, размераны тэмп, адпаведны чалавечым крокам. Такі нумар ідэальна падышоў бы да шпацыру! Вось толькі тое падарожжа — на вайну. Не цацачную, не камп'ютарную — сапраўдную. Невыпадкова ў канцы спектакля лялькі спрэс знікаюць: як аказалася, усё было — усур'ёз. Пра гэта нас і папярэджваў вялікі барабан на пярэднім плане збоку. Яго жывое гучанне не толькі сімвалізуе перасцярогу, але і адсылае да традыцый тэатра масак. Спасылку "ўглыб стагоддзяў" дае і зварот да старадаўніх доўгіх трубаў, праз якія абвяшчаюць ваенны паход. На часавую ўсеахопнасць праблематыкі працуюць таксама "а-ля ірландскія" танцы, якімі артысты візуалізуюць паходжанне Гэлі Гэя, вынас таблічак з нумарацыяй напаўаголенай прыгажуняй (у п'есе нумары выкрыквае адзін з салдатаў — Шэлі).

У спектаклі няма "залішніх дробязяў". На тым жа барабане — надпіс "beg bick". З аднаго боку, гэтыя словы складаюцца ў імя ўдавы, што трымае паходную карчму. З другога — перакладаюцца як "жабраваць". Да таго ж, дапаўняюцца пастаянным узнікненнем надпісаў на задніку (праз такія "апорныя словы", што даюцца выключна па-нямецку і тым самым працягваюць нямецкамоўную назву спектакля, можна пачаць вывучыць мову). Нарэшце, дадаткова апраўдваюць нямецкую гаворку — дакладней, экзальтаваны крык Крывавай пяцярні (Аляксандр Васько) у фінале, дзе праводзяцца прамыя аналогіі з фашызмам. А само груканне ў барабан перагукаецца з біццём чарпаком у пустую каструлю (жонка Гэлі Гэя — Любоў Галушка). Дарэчы, той жа чарпак ператворыцца ў мікрафон. А ў барабан у адной са сцэн будуць біць не звычайнай ляскоткай, а плёткай з трыма хвастамі, намякаючы на магчымае пакаранне салдатаў, калі ў іх не знойдзецца чацвёртага.

У адной са сцэн — з цяньцзынскім бонзам (Уладзімір Грамовіч) — рэжысёр прыбягае да паралельнага дзеяння, дэманструючы на сцэне адначасова "мір" і "вайну". Але ў цэлым спектакль, нягледзячы на шматлікія скарачэнні, захоўвае ўласцівую Брэхту нетаропкую эпічнасць. Каб у гледача, прывучанага да мігцення карцінак, заставаўся час на падумаць. Не пра вайну — пра чалавека. Пра сябе самога і вайну ўнутры сябе.

Канструктар годнасці

Настасся ПАНКРАТАВА

Мас-медыя столькі разоў паўтаралі, што рэжысура інтэлектуала Аляксея Ляляўскага надзвычай складаная і шматслойная: маўляў, у яго спектаклях не адразу ды і не кожнаму ўдаецца прачытаць падтэксты і зразумець тонкую філасофію, але гэтым разам галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек вырашыў сыграць з публікай і крытыкамі ў паддаўкі (праўда — і ў гэтым увесь Ляляўскі — па сваіх правілах). Mann ist Mann па Бертольду Брэхту — спектакль абсалютна канкрэтны, зразумелы. Пры гэтым ён пакідае за гледачом права самому вырашаць, ці счытваць убачанае толькі па паверхневым слоі (вельмі якасным і надзвычай відовішчным), ці, узяўшы пастаноўку за зыходны пункт, глыбей зазірнуць у сябе ды з шырока расплюшчанымі вачыма азірнуцца навокал.

Рэжысёр аддае на водкуп гледачу нават назву спектакля. Як вядома, класічны савецкі пераклад гучаў як "Што той салдат, што гэты", даслоўна ж фраза, якую нямецкі драматург вынес на вокладку, азначае: "Чалавек ёсць чалавек". Падрадковік бліжэй да пастаноўкі мінскіх лялечнікаў, якія распавядаюць, што няма чаго перакладваць адказнасць за перамены ў сабе на атачэнне.

Брэхту не ідуць пампезныя ды груваcткія дэкарацыі, таму пастановачная група абыходзіцца ўмоўнымі "гарамі" са старых стэрыякалонак, бялюткім заднікам і цугам металічных сталоў, з якіх так лёгка пабудаваць паходную карчму, цягнік альбо расстрэльны пляц. Падчас спектакля паступова прыходзіць усведамленне, што, адпаведна словам першакрыніцы, сапраўды разабраць і сабраць чалавека наноў надзвычай проста — відаць, так жа лёгка, як перасунуць тыя сталы, стварыўшы на адным і тым жа пятачку сцэны розныя "ландшафты".

Магчымасць імгненнай трансфармацыі асобы падмацоўваюць аднолькавыя на ўвесь акцёрскі склад касцюмы: маўляў, дадай спадніцу — атрымаецца жанчына, павесь на шыю аўтамат — і былы грузчык на вачах ператворыцца ў машыну для забойства. Мастак-пастаноўшчык Людміла Скітовіч напаўняе сцэну цацачнымі танкамі на пульце кіравання, наўмысна нязграбнымі, вуглаватымі лялькамі, тым самым падкрэсліваючы падназву пастаноўкі: "Гульня ў салдацікі, альбо Камедыя пра чалавека, які не мог сказаць "не". Страшна толькі, што тая забава хутка пераходзіць на падлік жыццяў жывых людзей.

Падаецца, рэжысёру надакучыла цягнуць да самапазнання гледача, які не жадае бачыць свет глыбей, чым яго паказваюць па тэлевізары. Прэм'ера напоўнена зразумелымі сімваламі: дымавая завеса туману, чырвонае святло як прадвеснік крывавых падзей, дзі-джэй з вяртушкай, што выдае сучасныя трэкі — "камплімент" старэйшым школьнікам, якіх смела можна весці на адно (на першы погляд) антымілітарысцкую пастаноўку. Больш запатрабаваная публіка адчуе, як падсвечвае рэжысёрскую задуму музыка Леаніда Паўлёнка, раз-пораз аздобленая шыкоўным сольным выкананнем Кацярыны Трафімук.

Сталічны тэатр лялек заўсёды вызначаўся надзвычайна зладжаным акцёрскім ансамблем, сённяшняя прэм'ера — не выключэнне. Абаяльны злодзей-начальнік заслужанага артыста Беларусі Аляксандра Васько, рознахарактарныя вобразы салдатаў Цімура Муратава, Дзмітрыя Рачкоўскага, Ільі Соцікава, Валерыя Зяленскага, нервовы герой заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра Грамовіча, фактурныя жаночыя вобразы Любові Галушка і Кацярыны Трафімук — гэта той раскошны фон, на якім больш яскрава праяўляецца жудасць ператварэння галоўнага персанажа-веселуна грузчыка Гэлі Гэя (Дзмітрый Чуйкоў) у салдата з чужым імем, што атрымлівае асалоду ад забойства.

Зразумелы тэкст, ясныя вобразы, дакладныя словы. Відаць, каб у чарговы раз журналісты не запытваліся ў рэжысёра, што той хацеў сказаць сваім спектаклем, Ляляўскі саступае ад сваіх правілаў і выдае напрыканцы сапраўднае маралітэ (але, ізноў-такі, у адпаведнасці з першакрыніцай — нямецкі драматург устаўляў маналог "Бертольд Брэхт гаворыць…" у сярэдзіну п'есы). Для чаго такі жарт з публікай? Магчыма, каб задзейнічаць усе пласты аўдыторыі: і тых, хто ідзе на празначаную нямецкім класікам камедыю ды сапраўды хоча парагатаць, і тых, хто здыме "вяршкі" сэнсу пра межы чалавечай годнасці і этычнасці. Пры гэтым не забыўшыся на гледачоў, якія ўмеюць праводзіць паралелі і прагнуць зазірнуць глыбей. Яны адчуюць доўгі прысмак рэжысёрскай горычы. Горычы, што чалавек не мяняецца.

Можна чвэрць стагоддзя распавядаць пра годнасць кожнай асобы і пра каштоўнасць чалавечага жыцця. Але варта толькі замаячыць на гарызонце абрысу стагадовага карабля-прывіда, як уся адукацыя, глыбіня і дасведчанасць злятае з чалавека, як шалупінне. І той ізноў бяжыць не чытаючы асуджаць, а для падмацавання сваіх эмоцый паліць машыны ля кінатэатраў і абвяшчае анафему рэжысёру. Натоўп, хутка страчваючы аблічча, праследуе музыканта, чыя гітара яшчэ не так даўно для многіх стаяла ў чырвоным куце. Публіка, якая яшчэ колькі месяцаў таму апладзіравала вядомаму рэжысёру краіны-суседкі, сёння паддаквае: "Без віны не арыштуюць".

Чалавек слабы. Ён шукае сабе апраўданне, спісваючы сваё паводзіны на "шкоднае" акружэнне, якое "прымусіла паступіць" гэтак. Але якой бы ні была кампанія, ніхто не прымушаў сцэнічнага Гэлі Гэя сваім кулямётам зносіць крэпасць з ні ў чым не вінаватымі бежанцамі. Так і несцэнічнага чалавека ніякая машына не пазбавіць этычнасці. Сваё сумленне можа растаптаць толькі сам яго ўладальнік. К

Замежныя крытыкі ў адзін голас адзначылі стыльнасць, чысціню выканання і дасягненне эфекту мінімумам сродкаў "Опіума".

Наша васьмёрка не ўпала з "Вежы"

Беларуская палітра міжнароднага фестывалю

На любым конкурсе ці фестывалі адно з самых хвалюючых пытанняў — як выступілі нашы. На XXII Міжнародным тэатральным фестывалі "Белая Вежа" ў Брэсце была прадстаўлена рэкордная колькасць беларускіх спектакляў — 8 (на фоне 20-ці замежных з 13-ці іншых краін). Як жа ўспрымалася "наша васьмёрка" не ў прасторы айчыннай культуры, а сярод тытулаваных конкурсна-гасцявых пастановак?

Надзея БУНЦЭВІЧ

Калі падсумоўваць адным словам — годна. Двума — вельмі годна. Трыма — вельмі-вельмі годна. Аб'ектыўныя доказы? На сем конкурсных спектакляў (балет Вольгі Скварцовай "Весна священна ли…" ішоў ужо пасля падвядзення вынікаў) — ажно чатыры дыпломы ў розных намінацыях. І шмат добрых слоў ад замежных спецыялістаў — як на публічных абмеркаваннях, так і, што вельмі важна, у кулуарах. А дзве масквічкі — маладыя крытыкі з багатым фестывальным вопытам — увогуле былі ўпэўнены, што прадэманстраванае ў Брэсце высокае тэатральнае мастацтва Беларусі вынікае з-за геаграфічнай блізкасці да Еўропы: пэўна, вашы рэжысёры скрозь цікавяцца тамтэйшымі навінкамі, ездзяць ледзь не на ўсе заходнія прэм'еры і арыентуюцца выключна на лепшыя сусветныя дасягненні. Эх, каб гэтыя словы ды былі б рэальнасцю!..

Не будзем заплюшчваць вочы на праблемы. Бо калі перамагчы жаданне тыражаваць вышэйзгаданае "вельмі-вельмі" да бясконцасці, давядзецца прызнаць, што агульны ўзровень спектакляў быў, шчыра кажучы, розным. А аднаму з іх тыя ж маскоўскія крытыкі ўвогуле прапаноўвалі ўручыць штосьці накшталт "Сярэбранага галёша" — дыплома "за горшы спектакль" усяго форуму. Але ж з'ехалі крыху раней, не даглядзеўшы конкурсныя паказы да канца. Насамрэч, каб існавала такая "антыпрэмія" (што ў талерантнай, спагадлівай, інтэлігентна стрыманай Беларусі папросту немагчыма), дык яна павінна была б адрасавацца іншаму спектаклю — замежнаму. Бо наш быў сціпла-ніякаватым, а той замежны — з амбіцыйнай прэтэнзіяй на сучаснасць і суперканцэпцыйнасць, ды пазбаўлены элементарнага густу, пачуцця меры і прафесійнага рэжысёрскага падыходу.

Сярод айчынных былі спектаклі не толькі дзяржаўных рэпертуарных тэатраў. Больш за тое, фестываль у чарговы раз дапамог усвядоміць простую ісціну: найпершы складнік, неабходны для нараджэння добрага спектакля, — яркая творчая асоба. А тое, які статус мае спектакль, належыць ён дзяржаўнаму тэатру ці з'яўляецца прыватным творчым праектам, — рэч другасная. І перакананасць, што рэпертуарны тэатр, у адрозненне ад праектнага, служыць беражліваму захаванню вялікай колькасці адметных спектакляў — усяго толькі міф (пра фестывальны паказ "Пінскай шляхты" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы гл. № 38). Затое абедзве формы, як ні дзіўна, могуць сябраваць, прычым узаемавыйгрышна.

Прыкладам апошняга стаўся монаспектакль "Дарожка мая", узнагароджаны "За высокамастацкае засваенне беларускага фальклору". Афіцыйна ён уваходзіць у рэпертуар гаспадара фестывалю, Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы. Але з'явіўся як творчы праект Івана Кірчука. Той ужо многа гадоў практыкуе канцэрты на аснове беларускага фальклору, які становіцца адпраўным пунктам яго шматлікіх уласных кампазіцый. Збіральнік і даследчык народнай музычнай культуры, лідар гурта "Тройца" і аўтар некалькіх кніг, Кірчук праводзіў падобныя імпрэзы і раней, у тым ліку без удзелу іншых артыстаў: спяваў песні (пад уласнае інструментальнае суправаджэнне), расказваў пра іх, пра народныя абрады і традыцыі, паказваў музычныя інструменты, якія станавіліся паўнавартаснымі дзеючымі асобамі гэтай крыху містычнай "музычнай варажбы". Адчуўшы структурную блізкасць між найбольш старадаўнімі фальклорнымі замовамі-заклічкамі і сучасным музычным мінімалізмам (і там і тут паўтараюцца сціслыя папеўкі-патэрны з іх далейшымі амаль незаўважнымі зменамі), ён звычайна занураў слухачоў у стан медытацыі: заплюшчвай вочы ў паўзмроку — і плыві па хвалях успамінаў-адчуванняў, філасофствуй на мяжы мікра- і макракосмасу. Менавіта такая музычная драматургія — бесканфліктная, падобная не да адзінай мэтанакіраванай лініі з яе паслядоўным разгортам, а да колаў, што разыходзяцца па вадзе, — з'яўляецца адным з трэндаў пачатку XXI стагоддзя.

Гродзенскі драмтэатр паказаў у Брэсце "451^0 па Фарэнгейце" па матывах рамана Рэя Брэдберы.

Балет Вольгі Скварцовай "Весна священна ли..." паказалі ў пазаконкурснай праграме.

Купалаўцы прывезлі на фестываль "Пінскую шляхту". / Фота Дзмітрыя КУХАРЧУКА

Новы праект Кірчука, паранейшаму захоўваючы лекцыйна-канцэртны пачатак (аповед пра нацыянальныя традыцыі і іх дэманстрацыя праз песні), пабудаваны на іншай драматургіі — менавіта тэатральнай. "Дарожка мая" становіцца аповедам пра чалавечае жыццё (так званы сямейна-абрадавы цыкл беларускага фальклору) — і жыццё сусвету, заснаванае на сонечным колазвароце, змене пораў года. А таксама на чатырох папраўдзе "касмічных" стыхіях: зямля, вада, агонь, паветра, што трансфармуецца ў нябёсы. Абедзве лініі — прыроды і чалавека — сплятаюцца праз каляндарна-абрадавы цыкл народнай песеннасці, на які накладаюцца і асноўныя царкоўныя святы. Пры ўсёй разнастайнасці жанравых вытокаў, неверагодным сінтэзе фолька з прафесійнымі мастацкімі плынямі — спектакль быццам акантаваны калыханкай, "закалыхванне" якой набывае амбівалентнасць, сімвалізуючы ў пачатку — нараджэнне, потым — смерць. І адначасова новае нараджэнне!

Як чалавечае жыццё спалучаецца з жыццём Хрыста і прыроднымі з'явамі, бо паўсюль узнікаюць паралелі, так і ўласна беларускасць, нацыянальны пачатак не замкнёныя ў нейкую "рэзервацыю", а ўспрымаюцца часткай сусветных працэсаў. Выведзена ў спектаклі і папраўдзе навуковая ідэя самой структуры нацыянальнага, што складаецца не адно з асаблівых рысаў, але і з вялікага пласта агульначалавечых.

"Дзеючымі асобамі" монаспектакля становяцца не толькі выкарыстаныя ў ім лялькі, маскі, звязаныя з абрадавасцю, але і самі музычныя інструменты: разгалінаванае сямейства акарынаў, шматлікія дудкі (не блытаць з дудой: яе якраз і няма), свістулькі, разнастайныя ўдарныя (ажно да каменьчыкаў і казіных капытоў), басэтля, гуслі, варган (варганы ў нас былі знойдзены ў час археалагічных раскопаў, у тым ліку на Берасцейшчыне, а малады беларускі кампазітар Аляксей Пілатаў напісаў нядаўна нават Канцэрт для віргана з аркестрам).

Ператварэнню сінтэзаванага дзеяння ў паўнавартасны спектакль садзейнічалі такія тэатральныя атрыбуты, як сцэнаграфія брэсцкага мастака Уладзіміра Ткачэнкі, вядомага пад творчым псеўданімам Міраўлад Палачыч, і ўдалыя светлавыя эфекты. Камерная сцэна не загрувашчана збудаваннямі-прыладамі. На першым плане — суцэльная "дарожка" музычных інструментаў: на спецыяльных падстаўках ці проста на падлозе. Паслядоўна рухаючыся ад аднаго да другога, за час спектакля расказчык, спявак і мульцiінструменталіст у адной асобе праходзіць не толькі віртуальную "дарожку", але і гэтую рэальную — праз усю авансцэну. Яшчэ адну цалкам рэальную "сцяжыну" ствараюць распасцёртыя ручнікі, разасланыя ў адну лінію. Да гэткай "лінейнасці" далучаюцца два вялізныя кругі. Адзін падобны да плеценай "сурвэткі" — чым не сонца ў выглядзе своеасаблівай "выцінанкі"? Другое кола — поўня, быццам вытканая роўнымі ніткамі-"дарожкамі". А наводдаль — вертыкальныя ніткі-промні-"дарожкі" ўтвараюць слуп срэбнага "дажджу", падобны да касмічнага светлавога патоку. Менавіта з яго выходзіць артыст у пачатку спектакля — і ў яго ж сыходзіць у фінале.

Не змяншаючы заслугі Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы і яго кіраўніка Аляксандра Козака ў наданні добрай "упакоўкі" працы Івана Кірчука, на наступным фестывалі, як справядліва адзначыла ў час падвядзення вынікаў лідар беларускага тэатразнаўства, прафесар Таццяна Арлова, хацелася б убачыць спектакль, падрыхтаваны самой брэсцкай трупай.

Іншыя беларускія спектаклі не патрабуюць паглыбленага аналізу, бо кожны з іх у свой час ужо меў разгорнутую рэцэнзію на старонках "К". Лепшым монаспектаклем прызналі "Сінюю-сінюю..." Магілёўскага абласнога тэатра лялек. Дадам, што ў параўнанні з вясновай прэм'ерай (гл. "К" № 13) Мікалай Сцешыц правёў размоўную лінію сваёй ролі больш цэласна, без залішняй патэтыкі, а ў маляванні пяском увогуле дасягнуў узроўню лепшых прафесіяналаў гэтага мастацтва.

Дыплом "За развіццё мовы пластычнага тэатра" атрымаў "Залаты век, ці Трыумф Deus ex machina" сталічнага Тэатра "ІнЖэст" (гл. "К" № 30 за 2015 г.). На абмеркаванні крытыкі выказвалі не толькі захапленне відовішчнасцю і семантычным багаццем спектакля, але і спадзеў, што калектыў будзе выступаць часцей.

"Опіум" Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў "Арт карпарэйшн" (гл. "К" № 43 за 2016 г.) паказваўся на форуме двойчы, яго паглядзелі ўсе пяцёра замежных крытыкаў, большасць якіх ладзіць уласныя тэатральныя фестывалі. Усе ў адзін голас адзначылі яго стыльнасць, чысціню выканання, дасягненне эфекту мінімумам сродкаў — і аддалі яму пальму першынства ў намінацыі "Лепшы спектакль малой формы".

Шкада, што не ўсе змаглі пабачыць згаданы раней балет "Вясна..." Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра (гл. "К" № 33). Ён быў па-за конкурсам, але мог бы ўпрыгожыць не толькі ўласна тэатральную афішу, а і праграму любога фестывалю сучаснай харэаграфіі.

Не самым удалым, мякка кажучы, аказаўся спектакль "451^0 па Фарэнгейце" Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Але ўдзел калектыва ў фестывалі, шчырая размова з запрошанымі крытыкамі павінны стаць карыснымі для трупы на чале з галоўным рэжысёрам Генадзем Мушпертам. Тым больш, што ў творчым багажы гродзенцаў мелася нямала выдатных прац.

Не сталіся "суперадкрыццём" мальераўскія "Манерніцы" Брэсцкага тэатра лялек. Затое літаральна праз два дні пасля завяршэння форуму трупа "выбухнула" неверагоднай "Новай зямлёй". Але пра гэта — у наступным нумары "К". К

Пра закладкі-закліканкі, свята капусты і “Князеўскую рассыпуху”

Статыстыка — рэч упартая: што ні кажы, а летам на нашу паштовую скрыню прыходзіць самая вялікая колькасць лістоў. І зразумела, чаму так адбываецца: у гэты час па ўсёй Беларусі ладзяцца шматлікія фестывалі і канцэрты, праходзяць дні вёсак і гарадоў ды іншыя культурныя акцыі. Але і цяпер, у верасні, падчас яшчэ аднаго лета — як кажуць у народзе, бабінага, — плынь лістоў і розных паведамленняў ад работнікаў культуры на адрас “К” не перапыняецца. Прадстаўляем дайджэст культурных мерапрыемстваў, што адбыліся ў розных кутках нашай краіны цягам апошніх некалькіх тыдняў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ



Незвычайны фотакалаж Аляксандра Навумчыка з выставы “#Мойгорад”.

“Бульбяны кірмаш” у аграгарадку Баруны...

...і “Князеўская рассыпуха” ў Зэльвенскім раёне.

На рэдакцыйную пошту працягваюць паступаць лісты, у якіх распавядаецца пра мерапрыемствы з нагоды прафесійнага свята бібліятэкараў — Дня бібліятэк. Як паведаміла метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Мастоўскай** раённай бібліятэкі **Вольга Коршун**, адна з такіх імпрэз адбылася 15 верасня ў раённай кніжніцы. Падчас рэкламна-іміджавай акцыі “Ачаг культуры і дабра” для наведвальнікаў працавалі кніжная выстава-парада “Прыйшоў. Убачыў. Перамог!” і выстава конкурсных фотаработ “Маё жыццё ў бібліятэцы — бібліятэка ў маім жыцці”. Наведвальнікаў абанемента чакала гульня “Кнігі на вагу”, калі кожны чытач мог узважыць выбраную літаратуру ў авосьцы. Таксама была праведзена акцыя “Бібліяінфармацыя”, раздача флаераў, якія рэкламуюць чытанне, кнігу і бібліятэчныя паслугі. Акрамя таго, адбылося адкрыццё міні-музея “Свет дакамп’ютарнай тэхнікі”. Пра гісторыю стварэння музейнай экспазіцыі расказала Таццяна Валчкевіч, якая цягам 20 гадоў узначальвала калектыў Мастоўскай ЦБС.

Метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Свіслацкай** раённай бібліятэкі **Алена Рабчанка** распавяла пра інфармацыйны тыдзень “Гаворым і чытаем па-беларуску”, зладжаны з 11 па 17 верасня. Цягам гэтых 7 дзён у бібліятэках Свіслаччыны гучала беларуская мова, дэманстраваліся адпаведныя тэматычныя выставы, а ўвага чытачоў была звернута на кнігі айчынных аўтараў. Натуральна, не былі забытыя і самыя маленькія наведвальнікі. *“Падчас правядзення раённай акцыі “Беларуская кніга — кожнаму дзіцяці” бібліятэкары прапаноўвалі творы беларускіх аўтараў, а каб выклікаць у юных чытачоў большую цікавасць да кнігі на роднай мове, мы аздобілі іх маляўнічымі закладкамі-закліканкамі: “Пачытай, гэта цікава!”, “Вітаем беларускую кнігу!”, “Чытаем беларускую казку”, “Я кніжка цікавая!” У дзіцячай бібліятэцы хіт-парад навінак “Беларуская кніга — дзецям” прадставіў кнігі сучасных беларускіх аўтараў А. Зэкава, М. Чарняўскага, У. Карызны, А. Пісьмянкова, В. Кудлачова і іншых. Гэта літаратура розных жанраў: казкі-чамучкі, вершы, апавяданні, прымаўлянкі-забаўлянкі, загадкі-задачкі”*, — піша Алена Рабчанка.

Свята “Хлеб, сыр, квас і добры настрой” прайшло 16 верасня ў **Навагрудку**. Праграму мерапрыемства склалі тэатралізаваныя імпрэзы. Можна было наведаць шматлікія падворкі са “смачнымі” назвамі кшталту “Хлебная даліна” або “Сырная ўзвышанасць”. На падворку “Востраў старажытных традыцый” адбывалася знаёмства са старадаўнімі тэхналогіямі вырабу хлеба. Там жа мелася магчымасць прадэгуставаць квас, хлеб, мёд, бліны, набыць лекавыя бальзамы, прыгатаваныя для гасцей свята ад Лаўрышаўскага Свята-Елісееўскага мужчынскага манастыра. Пра гэта паведаміла наш сталы аўтар — дырэктар Навагрудскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці **Наталля Кавальская**.

Першыя наведвальнікі міні-музея “Свет дакамп’ютарнай тэхнікі”, які адкрыўся ў Мастах.

Падчас свята “Хлеб, сыр, квас і добры настрой” у Навагрудку.

Россыпь лістоў прыйшоў да нас з **Ашмяншчыны**. Напрыклад, студэнтка Інстытута журналістыкі Інга Гіз распавяла пра свята капусты, што адбылося ў аграгарадку **Кальчуны** Ашмянскага раёна. Галоўнай на свяце, натуральна, была сама расліна: на зладжанай выставе яе можна было не толькі памацаць рукамі, але і пакаштаваць на смак ці набыць на міні-кірмашы.

“У Барунах прайшоў “Бульбяны кірмаш” — пад такім загалоўкам нам даслала свой допіс **Людміла Козел**. Свята, прысвечанае “другому хлебу” беларусаў, зладзілі супрацоўнікі **Барунскага** сельскага клуба і Ашмянскага раённага цэнтра культуры. Яны прапанавалі ўдзельнікам мерапрыемства насычаную культурную праграму, у якой былі і харэаграфічныя пастаноўкі, і тэатралізаваныя прадстаўленні, і святочныя конкурсы, і эстафеты ды многае іншае. Адбываліся і дэгустацыі народных страў з бульбы — пад спевы і музыку ўдзельнікаў народнага ансамбля народнай песні “Жытніца”, артыстаў народнага ансамбля цыганскай песні “Джана Рома” і лідара гурта беларускай сярэднявечнай музыкі Pawa Юрася Панкевіча.

Яшчэ адно “смачнае” свята прайшло на Ашмяншчыне ў аграгарадку **Крэйванцы**. Як піша **Аліна Санюк**, галоўнымі дзейнымі асобамі мерапрыемства пад назвай “Поўны кошык” сталі Баравік, Лісічка, Паганка і Мухамор. Героі-грыбы і былі кіраўнікамі свята, падчас якога дзеці і дарослыя адказвалі на жартоўныя пытанні віктарыны, удзельнічалі ў гульнях ды атрымлівалі заахвочвальныя падарункі. Некаторыя з жыхароў паселішча, якія выявілі свае кулінарныя здольнасці, атрымалі дыпломы раённага Цэнтра культуры. Таксама былі ўганараваныя пераможцы конкурса на лепшую грыбную страву і конкурса-марафона “Хто куды, а мы па грыбы”.

Апошні допіс — ад дырэктара мясцовага краязнаўчага музея імя Ф.К. Багушэвіча **Настассі Навіцкай**. Яна распавяла, што з 1 верасня па 15 кастрычніка ў музейнай установе працуе персанальная фотавыстава Аляксандра Навумчыка “#Мойгорад”. На ёй прадстаўлены фотаработы, дзе параўноўваюцца краявіды сучаснага горада і **Ашмян** мінулага стагоддзя. *“Наведвальнікаў выставы чакае шмат неспадзяваных сустрэч: то на сучаснай галоўнай вуліцы з’явіцца стары драўляны дом, то каля гандлёвага цэнтра паўстане група людзей з фотаздымка 1980-х гадоў. Як прызнаўся аўтар, падчас стварэння фотакалажаў ён адкрыў для сябе ў Ашмянах шмат новага з гісторыі”*, — піша Настасся.

Аграгарадок Крэйванцы прымаў свята “Поўны кошык”.

Свята бульбы днямі прайшло яшчэ і ў аграгарадку **Князева Зэльвенскага** раёна. “Князеўская рассыпуха” — ацаніце назву! — атрымалася вясёлым, каларытным і нават, як піша нам загадчыца аддзела па развіцці народнай творчасці Зэльвенскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці **Алена Ламека**, гістарычна-пазнавальным мерапрыемствам. Падчас свята можна было дазнацца пра гісторыю паходжання бульбы ў нашай краіне, пра яе лекавыя асаблівасці, паўдзельнічаць у конкурсах і дэгустацыях, на якіх былі прадстаўлены шматлікія шэдэўры кулінарнага мастацтва ад мясцовых гаспадынь, а таксама паслухаць музычныя нумары артыстаў Мастоўскага раёна.

З нагоды 20-годдзя ансамбля ўкраінскай песні і абраду **“Ватра”** (у перакладзе з украінскай — “полымя”) даслаў у “К” паведамленне пра гісторыю і сучаснае жыццё калектыву яго мастацкі кіраўнік **Аляксандр Валодчанка**. Ансамбль створаны ў 1996 годзе пры Мінскім грамадскім аб’яднанні ўкраінцаў “Заповіт”. Калектыў — неаднаразовы ўдзельнік і лаўрэат рэспубліканскіх, усеўкраінскіх і міжнародных фестываляў і конкурсаў у Гродне, Віцебску, Луцку і іншых гарадах Беларусі і Украіны. Яго апошняя перамога — першая прэмія на X усеўкраінскім фестывалі-конкурсе аматарскай творчасці “Пісенні візерункі”, які праходзіў у горадзе Буча Кіеўскай вобласці. *“Таксама калектыў з’яўляецца актыўным удзельнікам усемагчымых культурных акцый, якія арганізуюцца пры падтрымцы Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур і Мінскага грамадскага аб’яднання ўкраінцаў “Заповіт”. Акрамя таго, і самімі ўдзельнікамі “Ватры” праводзяцца музычныя вечары, якія карыстаюцца папулярнасцю ў гледача”*, — піша Аляксандр Валодчанка.

Пра яшчэ адзін творчы калектыў — народны ансамбль песні і музыкі “Вераснянка” з аграгарадка **Мазалава Віцебскага раёна** — нам паведаміў **Андрэй Струнчанка**. “Вераснянка” 24 верасня адзначыла 15-годдзе з дня свайго заснавання. З гэтай нагоды ў мясцовым Доме культуры адбылася творчая вечарына, што сабрала ўдзельнікаў ансамбля і яго сяброў — народны жаночы клуб “Залаты ўзрост”, танцавальны калектыў “Алар”, настаўнікаў дзіцячай школы мастацтваў і колішніх удзельнікаў “Вераснянкі”. За час свайго існавання ансамбль рэгулярна выступаў на ўсемагчымых пляцоўках, у тым ліку ў многіх вёсках Прыдзвіння, у Віцебску, Мінску, Оршы, Браславе, а таксама і за межамі краіны — на Пскоўшчыне і Смаленшчыне. Акрамя таго, калектыў рупіцца пра адраджэнне народных абрадаў і святаў, пра захаванне традыцый старажытнай беларускай кухні ды многае іншае.

К

"Лебядзінае возера" разлілося тут.

"Мой самы ясны позірк, мой самы лёгкі ўздых…"

Памятаеце ў класікаў: "Гэтым паўкрэслам майстар Гамбс пачынае новую партыю мэблі"? Дык вось, у бабруйскім Палацы мастацтваў "Лебядзіным возерам" Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр пачаў свой новы сезон. Каб на ўласныя вочы ўбачыць, як праходзяць балетныя спектаклі ў рэгіёнах, карэспандэнт "К" выправіўся ў паездку разам з трупай.

Стомленасць шансонам і аншлаг на класіку

Вядзьмарскае возера разлілося ў Бабруйску, куды выправіўся на гастролі Музычны тэатр

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Бабруйск — Мінск /
Фота аўтара

Мінск нас праводзіў дробным дажджом, а ледзь мы заехалі ў горад на Бярэзіне, як вызірнула сонейка. "Добрая прыкмета", — падумаў я і, як аказалася, меў рацыю: гастроль удалася. Публіка засталася задаволеная, а артысты адпрацавалі, як сказалі мне дасведчаныя людзі, на цвёрдую чацвёрку.

"На падмостках сцэны шмат гадоў змагаюцца дабро са злом…"

…як у спектаклі "Лебядзінае возера", што тэатр і прывёз у Бабруйск. Наогул, трупа актыўна выступае не толькі на ўласнай пляцоўцы: у мінулым сезоне яна шмат гастралявала па краіне, насычаным быў і замежны графік — толькі ў Германіі тое ж "Лебядзінае возера" і "Шчаўкунок" убачылі пяцьдзясят гарадоў! Што тычыцца гэтага сезону, то 2 кастрычніка балет выязджае ў Літву, а да канца года яго пастаноўкам будуць апладзіраваць у Вялікабрытаніі і зноў у ФРГ.

У Бабруйск калектыў паехаў у складзе з дваццаці чатырох танцораў і танцорак на чале са сваім дырэктарам і стваральнікам Уладзіславам Казінцом і галоўным балетмайстрам Кацярынай Фадзеевай. Да трупы далучыўся намеснік дырэктара тэатра па працы з гледачом і ідэалагічнай працы Уладзімір Шавялёў. Плюс тэхнічны персанал. Чаму выбар выпаў на Бабруйск? Як мне патлумачылі, у гэтым горадзе балет заўсёды добра прымаюць.

Пасля таго, як была падрыхтаваная пляцоўка, а большая частка гасцей здзейсніла экспрэс-шпацыр па горадзе, у 16.00 артысты выйшлі на сцэну — на так званы ўрок, які праводзіла Кацярына Фадзеева. Па завяршэнні размінкі надышла чарга "разводу па малюнках" — рэпетыцыі некаторых масавых і асобных сцэн балета.

Акрамя салістаў, увагу любога чалавека прыцягнулі б перш за ўсё яшчэ два члены трупы — японскія падданыя. Ёсікі Касака — нядаўняе "набыццё" тэатра, у спектаклі граў ролю Блазна (а па вуліцах хадзіў у павязцы, што прыкрывала нос і рот). А Маюка Она разам з калегамі выканала некалькі танцаў. Дарэчы, яна нават трохі ўмее па-беларуску, у чым журналіст "К" пераканаўся асабіста: папрасіў яе на сваёй дрэннай англійскай прыняць больш выйгрышную позу для фатаграфавання і падзякаваў "сэнксам". Маюка ўсміхнулася і ў адказ амаль без акцэнту прамовіла: "Дзякуй".

Гадзіны за паўтары да пачатку спектакля залу ў пошуку выбуховых рэчываў праверылі людзі ў камуфляжы з сабакам. Крамольнага яны не выявілі, але выбухі такі ў палацы прагучалі — апладысменты грымелі на працягу ўсёй пастаноўкі. Прычым, як адзначыў спадар Казінец, менавіта ў тыя моманты, калі яны і былі дарэчы — што казала аб "якасці" публікі. "Прабіла" і мяне — зусім не фаната гэтага віду мастацтва. Цяпер вось падумваю, а ці не падацца мне ў клакёры? Я адкрыты для такой прапановы, калі яна паступіць.

Каля 20.00 спектакль скончыўся, яшчэ гадзіна — на зваротныя зборы. І… да новых маіх сустрэч з вамі ў гэтым цыкле артыкулаў!

"Няма мастацтва прыгажэйшага за балет"

Аб'ём газетнай паласы не дазваляе выкласці ўсё тое, пра што я гаварыў з удзельнікамі і арганізатарамі імпрэзы за кулісамі, таму прывяду толькі некалькі фрагментаў.

Іна Новікава, дырэктар Палаца мастацтваў: "Занадта шмат усякага шансона было ў Бабруйску, а яго жыхары — я адчуваю — засумавалі па класіцы. І мы ўхапіліся за тое, каб балет Музычнага тэатра ў нас выступіў. Бабруйчане палац не падвялі: амаль аншлаг".

Кацярына Фадзеева: "Папрасіла перад спектаклем нацерці падлогу каніфоллю або працерці яе сухой анучай, паколькі артысты скардзіліся на тое, што ім слізка. Да таго ж, падлога дзе-нідзе няроўная, і гэта таксама можа прывесці да траўмы. Але, напрыклад, у Германіі нам трапляліся такія залы, што і наогул слоў няма".

Уладзімір Шавялёў: "Мы разумеем сваю місію: прапаноўваць беларусам балетнае мастацтва. Асабліва гэта тычыцца тых населеных пунктаў, у якіх, быць можа, ніколі балет і не бачылі. І паказваць не антрэпрызу, рэквізіт якой займае чамадан, а паўнавартасныя пастаноўкі з адпаведным іх афармленнем".

К. Фадзеева: "У балет прыходзяць новыя людзі, і "старыя" мяняюцца. У лепшым выпадку — ідуць з часам у нагу, пры гэтым не здраджваючы нейкім важным прынцыпам; у горшым — прыстасоўваюцца, штосьці важнае ламаючы ў сабе. Так і сённяшні балетны артыст. Часам ён шукае месца, дзе больш плацяць, не звяртаючы ўвагу на мастацкі ўзровень. Альбо такое. Калі я бачу, што людзям абыякава, паставілі іх у спектакль ці не — бо на зарплаце гэта не адаб'ецца, настрой псуецца. Занадта кароткі век у нашай прафесіі: трэба паспець адбыцца ў ёй, каб потым не было пакутліва балюча за зробленае ці не зробленае".

І. Новікава: "З народнымі танцамі ва ўстанове ўсё ў парадку, але ў моладзі горада ёсць запыт на павелічэнне калектываў, якія займаюцца сучаснай харэаграфіяй. Будзем рухацца ў гэтым кірунку. Паспрабуем стварыць і батлейку. Нядаўна ў Мінску пазнаёмілася з Іванам Кірчуком — лідарам гурта "Троіца", вядомым прапагандыстам каранёвай беларускай культуры. Абмеркавалі з ім магчымыя сумесныя праекты, якія можна рэалізаваць на базе палаца".

Уладзіслаў Казінец: "У нашым рэпертуары абавязкова з'явіцца пастаноўка, заснаваная на беларускім матэрыяле. Пакуль жа мы "трэніруемся" на сусветнай класіцы".

У. Шавялёў: "Наколькі я ў курсе, аўтары амаль не прапануюць Музычнаму тэатру творы на беларускай мове, на беларускія тэмы. Сумна, што тут можна сказаць!"

К. Фадзеева: "Кажуць, што ўзровень танцораў балета зніжаецца. Чаму гэта адбываецца? Рэгрэс пачынаецца з каледжаў. Каго ў іх цяпер прымаюць? Ды ледзь не ўсіх запар! А раней фізічныя дадзеныя абітурыента разглядалі ледзь не пад мікраскопам. Нешта трэба рабіць, не чакаючы, пакуль балет сапраўды стане дэградыраваць".

Алена Германовіч, выканаўца роляў Адэты і Адыліі ў "Лебядзіным возеры": "Як мне здаецца, цяперашнія выпускнікі каледжаў, якія рыхтуюць артыстаў нашага профілю, выглядаюць слабейшымі ў параўнанні з тымі, хто выпускаўся гадоў пяць таму. Прычын шмат: і амаладжэнне выкладчыцкага складу, і пачатковы ўзровень абітурыентаў, які пакідае жадаць лепшага, і тое, што ў каледжах цяпер вучаць нашаму рамяству не чатыры курсы, а тры".

У. Казінец: "На мой погляд, сёння беларускі балет перажывае не самыя лепшыя часы, але нічога страшнага ў гэтым няма. У любога мастацтва бываюць і пара росквіту, і нейкія застойныя перыяды. Балет — не субкультура, ён знікнуць не можа, новая цікавая хваля будзе і ў нас".

А. Германовіч: "З сыходам Валянціна Мікалаевіча Елізар'ева з вялікага беларускага балета ўзровень яго ўпаў. І вяртанне мэтра сведчыць пра пошук шляхоў для выпраўлення сітуацыі".

І. Новікава: "Трэба ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу палаца. Спадзяюся, у бліжэйшыя два гады абновім гукавое абсталяванне, светлавое, сцэнічнае".

У. Казінец: "На жаль, наш пашывачны цэх размешчаны не ў будынку тэатра. Артыстам на прымеркі прыходзіцца ездзіць, траціць на гэта асабісты час. Напружвае і сістэматычны рост коштаў на тканіну і прафесійны абутак. Ёсць праблемы і з нашымі замежнікамі, калі калектыву трэба выязджаць на гастролі ў Расію. Расіяне дзе-нідзе ўсталявалі кантроль на мяжы з Беларуссю, што наўпрост мае дачыненне да нашых японскіх артыстаў. Дробязь, здавалася б, але гэта выклікае нязручнасць".

У. Шавялёў: "Хваляванне перад рэканструкцыяй Музычнага тэатра, вядома, ёсць. Але без пляцовак мы, натуральна, не застанемся. І ў Мінску яны знойдуцца, і ва ўсёй рэспубліцы".

А. Германовіч: "Для мяне Музычны тэатр — гэта не другі, а першы дом".

К

Кацярына Фадзеева.

Іна Новікава.

Уладзіслаў Казінец у ролі Настаўніка.

Маюка Она.

Ёсікі Касака.

"…Балет, ты з даўніх часоў мой Бог".

Чым гэта, цікава, балетныя займаюцца ў грымёрцы?..

Словы пра Анатоля Александровіча

“К” працягвае друкаваць серыю “сяброўскіх нарысаў”. Мастак і літаратар Адам ГЛОБУС піша пра мастака-графіка Анатоля Александровіча.

Толя Александровіч. 1979 год.

Майстэрні

Бывае, нешта нейкае збярэшся рабіць, а так і не зробіш. Збольшага пра нязробленае хутка забываецца, але часам памятаеш доўга, цягам усяго жыцця. Мне так помняцца мастакоўскія майстэрні, якія парабілі сабе на гарышчах койданаўскіх бацькоўскіх хат Толя Александровіч і Вова Савіч. Вова паступіў у інстытут, Толя сканчаў вучэльню, а я даходжваў у сярэднюю школу. Бацькі дазволілі хлопцам абсталявацца на гарышчах, а мне дазвалялі толькі зрабіць хованку над хлявом. Зразумела. У іх — бацькі давалі дазвол, а ў мяне — баба і дзед. У сваёй хованцы я ляжаў на засланай посцілкамі саломе і чытаў. Там я нават і не маляваў ні разу, я хадзіў маляваць да Толі. Ён даваў паперу, акварэльныя фарбы і два пэндзлі — вялікі і малы.

“Боцман”

Толя Александровіч не проста любіў Уладзіміра Высоцкага. Толя Высоцкага абагаўляў. У маленечкай майстэрні вісела незлічоная колькасць фотаздымкаў куміра. З магнітафона несупынна гучалі ягоныя песні. Сам Толя вывучыў і паўтараў не толькі песні, а і рэплікі Высоцкага з розных фільмаў. Найбольш з “Небяспечных гастроляў” і “Служылі два таварышы”. Калі я падымаўся да Толі на гарышча, дык замест “Добры дзень” ці “Прывітанне” чуў ад яго сказанае голасам рыхтык, як у Высоцкага: “Боцман, дуй в дудку, строй команду... Адмирал на борту”.

Альбомы

Толя Александровіч набываў кнігі па мастацтве і завозіў іх з Мінска ў наша Койданава. Там яны стаялі ў зашклёным серванце ў вялікай і светлай залі бацькоўскага дома. Раз на тыдзень, у нядзельную раніцу Толя гартаў тыя альбомы і натхняўся. Калі ў яго быў добры настрой, тады і мне дазвалялася пагартаць каштоўныя альбомы і панатхняцца разам з ім.

Урубель

Толя захапляўся творчасцю рамантыка Міхаіла Урубеля, асаблівае ўзрушэнне выклікалі ўрубелеўскія акварэлі. Пра “Ружу” ён мог разважаць бясконца. “Ты заўважыў, як старанна вылеплены пялёсткі? Столькі працы, а свежасць і празрыстасць засталіся. А ягоная шклянка з вадою? Глядзіш — і адчуваеш яе напоўненасць і ўстойлівасць. Урубель — вялікі і непаўторны мастак. Яго трэба ведаць, у яго трэба вучыцца, ён варты любові...”

Толя старанна вывучаў творчасць Міхаіла Урубеля. Яму былі блізкія ўрубелеўскія тэатральнасць, казачнасць ды кніжнасць. Разам з усім станоўчым, што ўтойвалася ў спадчыне Урубеля, Толя атрымаў і шмат адмоўнага. Хваравітасць, дэманічнасць, надломленасць перайшлі ад майстра эпохі мадэрна да Толі. Халодная, колкая і ліловая зорка Урубеля заўжды ззяла ў майстэрні Александровіча.

Мара

У юнацтве Толя марыў паплаваць на белай яхце пад белымі ветразямі на Чорным моры са знакамітай спявачкай Ратару. Мара не спраўдзілася, але…

Толя меў адметную знешнасць. Ён быў такі прыгожы, што аднойчы спявачка Панароўская, пабачыўшы яго, перапыніла канцэрт і сказала: “Я выканаю песню пра прыгажуна ў “красной рубашоночке” для хлопца ў чырвонай кашулі, які стаіць каля дзвярэй”. Панароўская спявала для Толі Александровіча. Так што, упэўнены, і Ратару магла б для яго заспяваць.

Песні

Паўдарогі з дому на вучобу я з Толем праходзіў пешкі. Мы ішлі па вуліцы Апанскага і Урыцкага, ад Кальварыйскіх могілак на праспект. Па дарозе мы спявалі. Калі ты спяваеш, ісці ўдвая лягчэй. Правяраў шматкроць. Якіх толькі песень я не паспяваў у дарозе… Не пералічыць. З Толем мы спявалі Высоцкага пра Мінск. Спявалі Высоцкага і пра Толю:

В королевстве, где все тихо и складно,
Где ни войн, ни катаклизмов, ни бурь,
Появился дикий вепрь огромадный —
Толя — буйвол, Толя — бык, Толя — тур…

Мора

Так здарылася, што Толя Александровіч з жонкай Аленай і я адначасова адпачывалі на беразе Чорнага мора. Мы не толькі хадзілі на адзін пляж, мы яшчэ і жылі ў адной кватэры — у маёй цёткі Рэні. У Толі з Аленай быў асобны пакой, а ў мяне койкамесца на гаўбцы. Я ўставаў як мага раней, снедаў і бег на пляж, каб паплаваць і пазагараць, а потым хадзіў у горад маляваць. Толя з Аленай уставалі позна і няспешна ішлі на рынак па садавіну. Яны куплялі самыя вялікія і самыя дарагія яблыкі і грушы, бралі найлепшы вінаград, выбіралі самыя сакавітыя абрыкосы. Потым іх старана мылі. Рэня казала, што так старанна і так доўга ніхто на яе памяці садавіну не мыў.

На пляж Толя з Аленай ішлі ўвечары. Яны сядзелі на апусцелым пляжы, елі бездакорна вымытую садавіну і глядзелі на мора. Толя з Аленай сядзелі на пустым пляжы да самай ночы. Я не помню, каб яны купаліся ці хадзілі на якія танцы. Я нават не помню, каб яны на тым пляжы размаўлялі. Яны сядзелі моўчкі. Іх адпачынак звёўся да любавання вечаровым морам. Гадзінамі Толя з Аленай праседжвалі, гледзячы, як змяняецца і гасне святло на марской вадзе, як астывае паўднёвае неба. Пэўна, тады яны былі ў раі.

У тым адпачынку мяне расчаравала толькі адна акалічнасць: Толя не маляваў. Раней, да жаніцьбы з Аленай, ён не выпускаў з рукі аловак. Ён маляваў паўсюль і заўсёды. Разам з ім маляваў і я. У тым адпачынку я маляваў адзін і нават не паказваў яму свае новыя малюнкі.

“Босыя на вогнішчы”

Часам варта ўдакладніць, якім чынам той ці іншы мастак зрабіў свой твор. Ёсць майстры, якія на першае месца ставяць рацыю, яны робяць акуратныя і патрэбныя рэчы. Увесь узорны дызайн зроблены мастакамі разважлівымі і спакойнымі. Сустракаюцца творцы, якія прыслухоўваюцца да свайго сэрца, да сваіх рытмаў. Ёсць жывапісцы, што цікавяцца толькі эратычнымі пачуццямі. Пра такіх кажуць: “Міша сам ведаеш чым піша!”

Толя Александровіч маляваў нервова. Ягоныя найлепшыя вобразы былі сатканыя з аголеных тонкіх нерваў. Да афортаў, зробленых ім па матывах паэмы Міхася Чарота “Босыя на вогнішчы”, страшна дакрануцца. Здаецца, што ты атрымаеш смяротны ўдар токам. Гэтая серыя — безумоўна, самае лепшае са створанага Анатолем Александровічам. Ён зрабіў яе на апошнім курсе інстытута, гэта быў дыпломны праект. Рабіў, зрабіў і згарэў.

Толя выклаўся напоўніцу. Выклаўся так, што на абароне дыплома не мог стаяць. Ледзь жывы, ён сядзеў на крэсле і выслухоўваў хваласпевы пра сваю геніяльнасць і непаўторнасць. Тады яшчэ здавалася, што здароўе Толі паправіцца, што ён і далей будзе на цынкавых дошках выдрапваць нервовы космас новых і новых герояў, якія танчаць басанож на залатым вуголлі. Гэта толькі здавалася, на жаль.


Анатоль Александровіч. “Малюнкі да прозы Яраслава Пархуты”. 1995 год. Папера, туш.

Анатоль Александровіч. “Босыя на вогнішчы”. 1979 год. Афорт.

Вытанчанасць

Ён любіў вытанчанасць у рэчах і з’явах. Вэлюм, вільготныя складкі з найтанчэйшай тканіны, замець, імжа, шкло, крылы матылькоў і стракоз, акварэльнасць, летнія травы, дзьмухаўцы, пялёсткі… Чым танчэй і празрысцей, тым лепей для Толі. Аднаго разу ён цэлы тыдзень разважаў, як намалюе замець на мінскай вуліцы каля старой цёмна-чырвонай пажарнай. Не намаляваў, бо сама пажарная, як ні круціў, выглядала брутальнай.

Смерць

Смерць Толі Александровіча была для мяне поўнай нечаканасцю, а таму ў ёй я не бачу натуральнасці. Ён мог бы яшчэ жыць і працаваць. Ён, як на мой погляд, не назапасіў патрэбную колькасць грахоў, каб памерці. Толя быў сціплы, сарамлівы і ціхі. Ягонае паслухмянае жыццё прайшло ў кватэрнай майстэрні. Ён не хадзіў на парады, на мітынгі і шэсці. Ён жыў у свеце кніжнага і часопіснага мастацтва.

Калі памірае горкі п’яніца ці нахабны распуснік, ніхто моцна не дзівіцца ягонай смерці. Некаторыя нават уздыхаюць з палёгкай. Смерць пыхлівага, сквапнага, лянівага, злога ці зайздроснага чалавека гэтаксама не выклікае шмат слёз. Горка плачуць па заўчасна памерлых, плачуць над трунамі добрых і таленавітых. Толя быў са здольных, таму цяжка прыняць ягоную смерць за натуральную. Так цяжка прымаць і думкі пра ўласны скон. Як мала нам дадзена жыцця, як хутка яно мінае, як шкада страчваць блізкіх і дарагіх табе людзей. Толю, якога я называў старэйшым братам, шкада ажно да болю ў сэрцы.

Рэліквія

Сямейныя рэліквіі я захоўваю ў майстэрні. Ад маці да мяне перайшоў флакон з духамі. Некалі той шкляны, важкі, трошкі зеленаваты флакон належаў бабе Ядзе. У дзяцінстве я браў яго з трумо, падыходзіў да вакна і любаваўся, ён і цяпер цешыць вока. Побач з флаконам я паставіў на паліцу вялікі, на паўлітра, цёмна-сіні парцалянавы кубак. На тым кубку ёсць белыя, жоўтыя і аранжавыя кругі. Падобныя кубкі прадаваліся ў тутэйшых крамах напрыканцы шасцідзясятых гадоў. Ёсць у ім постканструктывісцкая чысціня. Кубак належаў Толю Александровічу. Восем гадоў ён піў з яго вечаровую і ранішняю гарбату, пакуль жыў у кватэры маіх бацькоў. Трыццаць гадоў кубак захоўваўся ў бацькоўскай варэльні, а цяпер стаіць, поўны рознакаляровых алоўкаў, у маёй майстэрні на відным і пачэсным месцы.

Адам ГЛОБУС,
літаратар, мастак

Перыпетый у лёсе гэтага чалавека хапіла б нават не на вагон з маленькай каляскай, а на цэлы чыгуначны састаў. Але быццё яны яму асабліва не ўскладнялі. Большасць з іх сталі прыступкамі да новага этапу ў яго творчай дзейнасці — можа, не ўсім бачнай, але надзвычай важнай для развіцця некамерцыйнай музыкі Беларусі. Пра такія павароты "Культура" і паразмаўляла з чарговым "лётчыкам" — Паўлам ЮРЦЭВІЧАМ.

Алег КЛІМАЎ /
Фота аўтара

Трубач не вылецеў у трубу

Аперацыя "Ы.Ы.Ы." і іншыя прыгоды Паўла Юрцэвіча

Павел Юрцэвіч, 45 гадоў. Нарадзіўся ў Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў) па класе трубы. Уваходзіў у склад гурта "Ы.Ы.Ы.". Дырэктар студыі гуказапісу. Арт-дырэктар мінскага клуба.

Каб не вусны...

— Растлумач маладому пакаленню, што з сябе ўяўляў сталічны гурт "Ы.Ы.Ы.", які некаторыя меламаны лічаць культавым. Чаму, дарэчы?

— Хай маладое пакаленне знойдзе ў інтэрнэце песню "Усё нармальна, мама" — але ў версіі "Ы.Ы.Ы", а не Элвіса Прэслі або аднайменнай айчыннай тэлепраграмы — і тады наконт культавасці гурта яму стане ўсё зразумела. Вельмі мала падобнага было на постсавецкай музычнай прасторы ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў. Мне і сёння цяжка дакладна вызначыць стылістыку, у якой мы гралі. Нешта было ўзятае ад кабарэ, нешта — ад класічнага панка: жорсткія гітары, агрэсіўныя рыфы. Плюс духавая секцыя, бэк-вакалісткі. Плюс канцэртны дрэс-код: хлопчыкі ў касцюмах і ідыёцкіх акулярах, дзяўчаты ў парыках і яркіх квятчастых сукенках, і франтмэн Вася Шугалей — у дзікай апранасе. І песні былі такія самыя, яны яўна ішлі ўразрэз з тагачаснай эстрадай, але пры гэтым усё — пра каханне, як яго разумеў ідэолаг гурта. Дзякуючы таму карнавалу і склалася кола прыхільнікаў — са звычайнай публікі, арганізатараў канцэртаў і фестываляў, мацёрых крытыкаў.

"Ы.Ы.Ы." культавы яшчэ і таму, што, безумоўна, стаў папярэднікам "Ляпіса Трубяцкога", які, у сваю чаргу, спарадзіў "Лепрыконсаў", пасля чаго ўзнікла процьма калектываў падобнага кшталту, самым вядомым з якіх я бы назваў "Ленінград" (вось толькі абсцэннай лексікі ў нашых песнях было значна менш).

— Ну так, "дудкі" ўсе гэтыя. А ты трубу абраў...

— На вусны мае паглядзі — самыя прыдатныя для амбушуры! Гены яшчэ, можа, сваю ролю адыгралі — у мяне ж тата флейтыст. Я з задавальненнем пачынаў займацца ва ўсіх спецыяльных установах, праз якія прайшоў: і ў музычнай школе, і ў вучэльні імя Глінкі, і ў "кульку". Але паступова запал ува мне згасаў. Да ўсяго, я тады жудасна хваляваўся падчас публічных сваіх выступаў, будзь то экзамены або канцэрты. Зорак з неба, карацей, не хапаў.

— Аднак ідэолаг "Ы.Ы.Ы." Васіль Шугалей цябе ў гурт паклікаў.

— У 1991 годзе. Але, між іншым, гэта я яго спярша запрасіў паўдзельнічаць у адным са святочных мерапрыемстваў, якія праходзілі ў вучэльні (Вася таксама ў ёй вучыўся). Памятаю, Шугалей прыцягнуў кніжачку з творамі Даніила Хармса: маўляў, можа, нешта з яе для "капусніку" спатрэбіцца. Менавіта дзякуючы ёй я назаўсёды на Хармса і "падсеў". У выніку, Вася ад майго запрашэння адмовіўся, але, даведаўшыся, што я граю на трубе, завабіў мяне ў "Ы.Ы.Ы.".

— Чаму ж такім кароткім аказаўся век гэтай самабытнай каманды?

— Выступалі для тых гадоў мы актыўна — і ў Беларусі і за яе межамі. Я з нейкага моманту ўзяў на сябе абавязкі адміністратара гурта: праводзіў рэпетыцыі, прабіваў канцэрты. Было няпроста: у "Ы.Ы.Ы." уваходзіла аж да дванаццаці чалавек, і не кожны арганізатар мог пацягнуць у фінансавым плане прывезці такі натоўп!

Да ўсяго, Шугалей заўсёды фантанаваў не толькі музыкай — ён яшчэ і пісаў вершы, маляваў карціны. Урэшце, ад "Ы.Ы.Ы." ён проста стаміўся і годзе ў 1993-м закрыў яго — прынамсі, як пастаянны канцэртны склад. Да комы з гурта ўжо "вылупіўся" фольк-праект "БазЫлькі" — з практычна тымі ж самымі музыкантамі плюс віяланчэль. А пасля таго, як Вася ў сярэдзіне 1990-х канчаткова пераехаў у Маскву, узнік дуэт "Чоко & Боко". Потым Шугалей стаў суарганізатарам тэлешоу "Сюрпрыз для Алы Пугачовай", сабраў гурт "20000 зажЫгалок", з кіно нешта там замуціў. Планаў шмат у яго было, у тым ліку, і датычных Беларусі. Я меў з ім зносіны аж да яго забойства ў 2004 годзе...

Каб усім было добра

— Скончыўшы ў 1997-м універ, ты ў музыцы не застаўся...

— А я ў той год ужо паспрабаваў сябе ў ролі бізнесмена — у фірме, звязанай з аптовым сыравінным гандлем. У мяне была маладая сям'я, сын нарадзіўся, і такім чынам я зарабляў грошы, прычым нядрэнныя. Але ў 2003-м мне зноў стала сумна, і я вярнуўся ў музыку, стварыўшы разам з Ігарам Плевіным студыю гуказапісу. Нейкіх глабальных рэвалюцый мы здзяйсняць не збіраліся — проста прапанавалі іншы падыход да якасці запісу. Яна тады ў краіне знаходзілася на ўзроўні 1990-х гадоў, мы ж імкнуліся зрабіць яе сучаснай і больш выразнай. Каб добра быў чутны кожны інструмент, каб ствараліся сапраўдныя аранжыроўкі, а не абы-што.

Мы практычна адмовіліся ад пагадзіннай аплаты нашай працы музыкантамі ("лічыльнік", які пастаянна накручвае грошы, шмат у чым і ўплывае на якасць, бо паспешлівасць спараджае невыразнасць). Яны запісваліся столькі, колькі ім трэба было, і цэннік для іх не задзіраўся. Студыя магла б нядрэнна зарабляць, каб яна працавала па звыклай ва ўсім свеце пагадзіннай схеме, але для нас самым важным было атрыманне менавіта якаснага прадукту. Таму і артысты сюды ішлі.

— З вамі, альтруістамі, мне ўсё ясна. А хто прайшоў праз вашы вушы?

— Гурты "Нейро Дюбель", The UNB, Naka, "Серебрянная свадьба", "Красные звезды", усе праекты Міхея Насарогава, Аляксандр Памідораў, Дзядзька Ваня... Але мы не толькі музыку запісвалі, а займаліся агучкай кінастужак (у прыватнасці тых, якія ў Мінску здымалі расійскія кампаніі), у нас дубляваліся на беларускай мове замежныя фільмы.

— Студыя па-ранейшаму працуе, так?

— Як ні дзіўна. І я па-ранейшаму яе дырэктар. Болей за тое — дасягнуўшы пастаўленай мэты — сучаснага якаснага запісу, я вырашыў выпрабаваць свае сілы ў клубнай сферы.

— Ведаю-ведаю, ты з'яўляешся арт-дырэктарам аднаго са сталічных клубаў. І з чаго складаюцца твае абавязкі?

— Зрабіць так, каб і музыкантам тут было ўтульна, і публіцы. І каб сам клуб ушчэнт не прагарэў, вядома. У Мінску вельмі мала месцаў, дзе граецца, назавем яе так, альтэрнатыўная музыка. Гэта, вядома, праблема, бо андэрграўндных выканаўцаў у нас процьма — хаця пра гэта мала хто ведае. Не ўсім жа граць у падземных пераходах — камусьці хочацца выйсці на сцэну і знайсці канкрэтна свайго слухача. Мы свядома даем пляцоўку менавіта такім выканаўцам — часам вельмі некамерцыйным. У асноўным, у нас прадстаўлены "цяжкія" і панк-склады, хіп-хопера. У клубе "засвяціліся" і замежныя артысты — з Японіі, напрыклад. І ніякіх кавераў — страўнікі публікі тут не абслугоўваюць!

— Канцэрты экстрэмальных гуртоў нярэдка забараняюцца: тэксты ў іх сам ведаеш, якія бываюць. Тваё да гэтага стаўленне?

— Мне зразумела, калі выступы адмяняюцца з прычыны таго, што ў песнях музыкантаў ёсць нейкія экстрэмісцкія пасылы. Ды і ўвогуле, тыя "мастсаветы", якія ў нас у пэўным фармаце існуюць і дасюль — рэч не зусім бессэнсоўная. Але асабіста мне хацелася б ведаць, скажам, што канкрэтна маецца на ўвазе пад фармулёўкай "нізкі мастацкі ўзровень" — а яе часам прымяняюць у падобных выпадках.

— Задаволены тым, як з 2013 года развіваецца яшчэ адно тваё "дзіця" — прэмія Rock Profi, сузаснавальнікам якой ты з'яўляешся?

— У цэлым так, але для таго, каб было яшчэ лепш, як звычайна не хапае грошай. Прэмія першапачаткова і не разлічвала на асаблівую спонсарскую ўвагу — гэта ж не гламурная ўзнагарода для "глянцавых" выканаўцаў, у тэлеверсію якой можна напхаць рэкламы. Наш кантынгент — рок-, інды- і альтэрнатыўныя музыканты. Але затое і вызначаюць лепшых "свае" — тыя ж музыканты, што працуюць у гэтых кірунках або людзі, якія разбіраюцца ў іх, кожны год такіх агулам набіраецца каля ста. Дзякуючы гэтай масавасці канчатковая ацэнка журы, якая складаецца з суб'ектыўных меркаванняў, у выніку выходзіць досыць аб'ектыўнай. Што нас выгадна адрозніваe ад іншых прэмій, дзе за ўсю айчынную музыку "адказваюць" чалавек дваццаць, не болей.

Творца другога плана

— Цяпер у якіх-небудзь калектывах граеш?

— Толькі ў якасці спецыяльна запрошанага госця — так і напішы! Апошні раз не так даўно падыграў на трубе на канцэрце гурта The UNB. А ў запісе — "Касіяпеі" на яе альбоме 2015 года "Крыжык".

— Значыць, з амбіцыямі лідара бэнда ў Паўла Юрцэвіча...

— Усё гэтак жа ніяк. Часам задумваўся над тым, пра што ты спытаў, спрабаваў прымерыць гэтую... місію. Мог бы пацягнуць? Мог бы. Але на другіх ролях я адчуваў і адчуваю сябе на сваім месцы.

К

Спасцігаем сусвет праз колер

Чытаеш нібыта пра “колер Беларусі” — а даведваешся пра традыцыі, побыт і адметнасць нацыянальнай культуры. Пра бурак як сімвал шляхетнасці і белыя калоны сціплых шляхецкіх сядзіб. Пра шэрых жывёлаў, што становяцца праваднікамі ў іншасвет, і забыты сімвалічны змест золата. Паэт, дызайнер, фатограф, даследчык Міхал АНЕМПАДЫСТАЎ аформіў сваю шматгадовую працу ў кнігу “Колер Беларусі”. Яна падзеленая на часткі адпаведна найбольш важным для Беларусі колерам, а за імі праглядаецца цэлы гістарычны і культурны кантэкст. Думаю, менавіта гэтую кнігу можна параіць тым скептыкам, якія не вераць у апрычонасць беларускай традыцыі.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

— Вы неяк казалі, што даследуеце “колеры Беларусі” ад моманту, “калі яшчэ нічога не было”. Тут узнікаюць сумненні: ці дастаткова ў нас інфармацыі пра самы пачатак развіцця чалавецтва для абгрунтаваных высноў?

— Факты, з якімі можна працаваць, ёсць, але для акадэмічнай навукі іх, мажліва, недастаткова. Увогуле колер — гэта нашае суб’ектыўнае адчуванне ад трапляння электрамагнітных хваляў на сятчатку вока. Адпаведна, без нас колераў няма. Дый нават успрымаючы колеры праз зрок, чалавек можа не мець жыццёва важнай патрэбы іх называць. У 1960-х амерыканскія навукоўцы Брэнт Берлін і Пол Кей прааналізавалі блізу 80 моваў — сучасныя літаратурныя, мёртвыя кшталту лацінскай, мовы прымітыўных культур — і прыйшлі да высновы, што парадак узнікнення асноўных колеранайменняў універсальны. Першымі ва ўсіх культурах з’яўляюцца назвы для белага і чорнага, потым для чырвонага і далей з нязначнымі варыяцыямі. Адначасова з моўным засваеннем колераў адбывалася і тэхналагічнае: чалавек вучыўся здабываць фарбавальнікі. Пасля чорнага і белага ўзнікненне новых колеранайменняў непасрэдна звязана з развіццём тэхналогій. Тут сапраўды не хапае інфармацыі, бо пафарбаваныя рэчы ў археалагічных культурах нашых абшараў захаваліся кепска.

— Вы сцвярджаеце, што разам з назвай колер атрымлівае сэнс і свядомае выкарыстанне?

— Дакладна! Колер — гэта спосаб спазнання і ўпарадкавання сусвету. Напрыклад, у старажытнай індыйскай традыцыі людзі падзяляюцца на варны (правільная назва таго, што ў нас прынята называць “кастай”), а варна — гэта ў перакладзе і ёсць “колер”. У нас, як і паўсюль, першымі каларонімамі былі “белае” і “чорнае”, прычым не толькі ў звычайным разуменні “святло-цемра”, а таксама ў значэнні “свой-чужы”, ці “гэты свет-іншасвет”. Цікава, што ў нашай традыцыі чорны не нясе выразна адмоўнай канатацыі. На Заходнім Палессі і Падляшшы гэтае колераспалучэнне захоўвалася ў арнаментыцы да першай паловы XX стагоддзя. А на Гродзеншчыне яно нават дасюль існуе ў сапоцкінскіх велікодных пісанках.

Наступным у нашай культуры, як і ў іншых, з’явілася колеранайменне чырвонага, і звязана яно ў першую чаргу з “засваеннем” сусвету праз тэхналогію. Найстарэйшыя з нам вядомых чырвоных фарбавальнікаў — гэта “армянская чырвань” і пурпур, што ўзгадваюцца ў Бібліі. Першы колер атрымлівалі з арарацкай кашэнілі — маленькай інсекты, якая на адным з этапаў жыццёвага цыклу прырастае да карэння расліны і становіцца яго часткай, а ў канцы гэтага перыяду, цягам толькі некалькіх дзён, напаўняецца кармінавай кіслатой: прыродным чырвоным пігментам. Пурпур, у сваю чаргу, рабіўся з марскіх слімакоў іглянак. Продкі славянаў таксама навучыліся здабываць “чырвоны” — прычым са сваёй сыравіны і па сваёй тэхналогіі, таму гэты колер такі важны для ўсіх славянскіх народаў. Для беларусаў таксама, але ў нашай культуры ўсё ж найважнейшы і найбольш улюбёны колер — белы, што, верагодна, тлумачыцца балцкай традыцыяй. Магчыма таму назва “Беларусь”, якая з чужой падачы канчаткова “прыстала” да нашых земляў толькі ў XVIII стагоддзі, ужо ў XIX стагоддзі дала імя этнасу, якое было прынятае маладой беларускай нацыяй у якасці саманазвы.

— А якую этымалогію мае наша абазначэнне чырвонага?

— Назвы базавых колераў у беларускай мове маюць інда-еўрапейскае паходжанне, але чырвоны — выключэнне. Назва гэтая ўласнаславянская і ўтворана ад слова “чарвец” — мясцовага віда кармінаноснай кашэнілі. Яна была распаўсюджана на абшарах сучаснай Польшчы, Украіны і Беларусі, часткова Літвы і Латвіі. Чырвоны колер стаў сімвалічным маркерам славян, што адбілася і ў мовах (узгадайце яшчэ і месяц чэрвень — час збора чарвяца), і ў геральдыцы. Адной з перадумоваў развіцця барвярства было ткацтва. На беларускіх землях ткацкія станкі з’явіліся за пару стагоддзяў да нашай эры, у зарубінецкай археалагічнай культуры, у якой адчуваюцца кельцкія ўплывы. Менавіта кельты першымі сярод “варварскіх” народаў паўночнай Еўропы пачалі актыўна фарбаваць тканіну. У тыя часы трэба было выжываць, а не марнаваць час і сілы на эстэтычны выгляд. А кельты марнавалі. Барвенне тканіны было сакральным дзеяннем, магіяй, часткай культуры зельніцтва — яму прыпісваліся лекавыя ўласцівасці, а сам працэс табуяваўся, выносіўся за межы вёскі, веды трымаліся ў сакрэце.

Здабыча чарвяца звязаная з распаўсюдам ткацтва і адсочваецца па тапонімах з коранем “чырв” — іх шмат у Польшчы, Заходняй і Паўночнай Украіне і на поўдні Беларусі. У позднім Сярэднявеччы чарвец складаў значную частку экспарту Літвы і Кароны Польскай у Заходнюю Еўропу — у XV стагоддзі ён пастаўляўся тонамі. Пры гэтым, каб сабраць кілаграм сушанай кашэнілі, трэба было выкапаць і перагледзець карэнні блізу пятнаццаці тысяч раслін! Мы вельмі мала ведаем пра тое, як працавала гэтая велізарная індустрыя — яўрэйская грамада, якая арганізоўвала ўвесь працэс ад збору да канчатковай рэалізацыі прадукта, свае гешэфты вяла паводле вуснай дамоўленасці, шляхце не выпадала афішаваць любы занятак камерцыяй, а сялянскі фальклор пакінуў нам звесткі адно толькі ў закамуфляваным выглядзе — у паданні пра папараць-кветку. Чарвяцовы бум квітнеў ажно пакуль не адкрылі Амерыку і не знайшлі там кашэніль мексіканскую — менавіта яна, а не золата і спецыі, стала галоўным аб’ектам іспанскага экспарту з Новага Свету.

— Атрымліваецца, у колера шлях прыкладна як у славянскага бога — спачатку ён увасабляецца ў натуральным асяроддзі, у паўсядзённасці, пасля чаго набывае сэнс і трапляе ў культуру.

— Хутчэй за ўсё, што не. Кожны з важных колераў беларускай культуры — белы, чорны, чырвоны (прычым іх лепш звязваць у пары белы-чорны, белы-чырвоны), залаты, блакітна-сіні, шэры і зялёны — мае ўласную гісторыю і закранае пэўную сферу дзейнасці чалавека. Культуры лясной зоны прынцыпова адрозніваюцца ад культураў стэпу: тут сусвет не ўспрымаўся ў катэгорыях апазіцый неба і зямля, дабро і зло. Беларусы дагэтуль як бы нявызначаныя: “яно можа і кепскае, але і не тое каб кепскае, а можа так і трэба...” Бо ў лесе неба не надта, каб неба. Яно закрыта дрэвамі. Тут ёсць зямля, але ёсць і багна, у лесе найпрасцейшая лінія паміж пунктамі — крывая, не апазіцыю, а сінтэз. Нашы продкі няшмат увагі надавалі чорнаму колеру, але, магчыма, ён быў асабліва важным для яцвягаў. Іншасветнасць у нас маркіруе сіні колер, а шэры — памежжа паміж светам белым і іншасветам. У нас усе сакральныя жывёлы — шэрыя. Каза, качка, качар, каўка... У беларускім дзіцячым фальклоры коцікі, зайчыкі і ваўчкі — усе шэрыя, з імі можна і трэба дамаўляцца, улашчваць. Шэры колер увогуле не мае негатыўнай канатацыі, ён вельмі беларускі, нават шляхта не толькі насіла жупаны з шэрага даматканага сукна-шарачка, але і называлася “шарачковай”.

— Сярод найгалоўнейшых колераў вы называеце залаты. У мяне ён асацыюецца з бляскам і раскошай, а гэта ўжо не з натуральнага асяроддзя.

— Гэтая традыцыя прыйшла да нас разам з хрысціянствам: золата, а менавіта ягоная здольнасць адбіваць святло і спараджаць дрыготкія рэфлексы, выдатна “паклалася” ў багаслоўскія канцэпцыі сутнасці Бога і Боскага. У візантыйскай іконе яно азначае нябачнае нам боскае святло, што пранізвае сусвет, але мы не ў стане яго ўгледзець. Першыя хрысціяне хацелі бачыць знакі боскай прысутнасці ў штодзённасці. Чаму не? Цуды Хрыстовыя адбыліся зусім нядаўна — можна сказаць, толькі што. Калі святло лічылася адной з боскіх праяваў, а пасля дыскусіі працягласцю ў некалькі стагоддзяў — сімвалам Божага, то золата і азначала гэтае нябачнае, неспазнавальнае і недасяжнае святло.

— А хіба не веліч і заможнасць?

— Дэманстрацыя ўласнага багацця, бляск, раскоша — гэта таксама прысутнічае ў візантыйскім стылі. Трэба, аднак, сказаць, што ў нашай традыцыі такая эстэтыка адсутнічае: першыя беларускія святыні маюць стрыманы, нардычны характар, золата там сімвал недасяжнага, а не інструмент самапраслаўлення. Новая трактоўка золата і новы перыяд яго папулярнасці як колера і як матэрыяла прыйшлі да нас разам з мастацтвам барока і контррэфармацыяй. Адначасова з распаўсюдам барока тут узнікае ідэалогія сарматызму. Калі Францыя коштам вялізных высілкаў робіць своеасаблівую культурную рэвалюцыю і ўпершыню ў гісторыі пачынае дыктаваць моду ўсім манархіям Еўропы, нашыя эліты, ужо цалкам і даўно інтэграваныя ў еўрапейскую культурную прастору, ігнаруюць агульныя трэнды і цягам блізу двух стагоддзяў выпрацоўваюць уласны сармацкі стыль. Адным з найважнейшых колераў для беларускіх сарматаў быў залаты — але без перагіну!

— Адпаведна, нам уласцівая сціпласць?

— У пэўнай меры. Напрыканцы XVIII стагоддзя, калі быць сарматам стала ўжо не модна, шляхта пакрысе перайначылася ў арыстакратаў, і з’явіўся пампезны, багаты, імперскі расійскі класіцызм (гэтая традыцыя знайшла працяг у “сталінскім класіцызме”, якога мы багата маем у Мінску), у нас паўстаў сціплы, мінімалістычны Віленскі класіцызм. Золата там зусім няшмат, хіба што ў якасці акцэнтаў, перавага аддаецца ламанай белі, шэрым колерам і вохры. Як гэта ні дзіўна, тутэйшая шляхта не толькі ўпадабала класіцызм — на той час стыль абсалютна рэвалюцыйны, — але і спалучыла яго з традыцыйным драўляным жытлом. Хрэстаматыйны шляхецкі “дворэк” з белымі калонамі і трохвугольным порцікам на ўваходзе — пераасэнсаваны антычны канон, рэпліка тутэйшых нашчадкаў міфічнага Палямона. Традыцыйны шляхецкі дом, паводле азначэння славутага фатографа Яна Булгака, мае тры якасці — простасць, годнасць і інтэграванасць у прыроду. Шляхта шанавала простасць у думках, паводзінах і стылі жыцця. І ў гэтым ёсць прыкмета нашай ментальнасці. К





Рэвельскі Монтэ-Крыста

Брат аўтара "Пінскай шляхты" — спадчыннік малдаўскага прастола

(Працяг. Пачатак у №34.)

"К" працягвае публікаваць "сямейную сагу" роду Марцінкевічаў, сюжэтныя калізіі якой не менш пакручастыя за сцэнарый якой-небудзь "Санта-Барбары". Як выявіў падчас сваіх карпатлівых даследаванняў гісторык-архівіст Зміцер Дрозд, пачынальнік новай беларускай літаратуры быў злучаны сваяцкімі повязямі з мноствам вядомых асоб свайго часу. У іх ліку і прэтэндэнт на малдаўскі трон Дзмітрый Канцямір, які 28 лютага 1804 года стаў цесцем брата Вінцэнта — Ігната Марцінкевіча.

Няўдалы фаварыт Кацярыны

Пра псіхічнае расстройства Дзмітрыя Канцяміра як прычыну яго заключэння ў Рэвельскую крэпасць сцвярджае нават "Вялікая расійская энцыклапедыя". А ўпершыню ў гістарычных дакументах аб яго вар'яцтве паведамляецца яшчэ ў снежні 1774-га, калі генерал-фельдмаршал граф Захар Рыгоравіч Чарнышоў (дарэчы, жанаты на стрыечнай сястры Дзмітрыя Канцяміра Ганне Ведэль) напісаў два лісты імператрыцы Кацярыне II. Ён паведамляў, што прыпадкі буянства, у якія ўпадаў князь, прымусілі Чарнышова адабраць у яго шпагу. Падчас аднаго з такіх прыступаў Дзмітрый Канцямір забіў свайго слугу. 25 снежня 1774 года імператрыца пераслала гэтыя лісты свайму фаварыту генералу-фельдмаршалу Рыгору Пацёмкіну-Таўрыческаму для прыняцця рашэння. Але для гэтага спатрэбілася больш за дзесяць гадоў.

У 1785 годзе за забойства селяніна сваёй слабады Рогані Трафіма Астапенкі Канцяміра выдалілі з яго маёнтка, які быў падвергнуты апякунскаму кіраванню. А 1 студзеня 1787 года імянным найвысокім указам Кацярына загадала: "Князя Канцяміра за смертазабойства селяніна яго і ў прадухіленне, каб ён па суровасці і шаленстве сваім не ўчыніў большага зла, заключыць навечна ў Рэвельскай крэпасці, прызначыўшы на яго ўтрыманне па 50 кап. у дзень з маёнтка ягонага".

Канцямір у сваіх лістах да Пацёмкіна (яны былі знаёмыя па ўдзеле ў руска-турэцкай вайне) скардзіўся на інтрыгі і ганенні сваякоў і адміністрацыі турмы ды маліў аб дапамозе. Але марна.

І тут нельга не згадаць аб знамянальнай падзеі ў жыцці Дзмітрыя Канцяміра і імператрыцы, якая папярэднічала яго "вар'яцтву". А ў якасці прэамбулы варта прывесці словы польскага гісторыка Казіміра Валішэўскага: "Фаварытызм быў у Расіі асноўным колам яе дзяржаўнага механізму... У кандыдатах ніколі не было недахопу. Месца было добрае, і пра яго марыла не адно славалюбнае сэрца. У гвардыі, гэтым традыцыйным пастаўшчыку дачаснікаў, былі заўсёды два ці тры прыгожыя афіцэры, якія ўпарта глядзелі ў бок імператарскага палаца з больш ці менш схаваным жаданнем і надзеяй. Ад часу да часу адзін з іх з'яўляўся пры двары, прадстаўлены якімнебудзь буйным саноўнікам, які зведваў шчасце правесці да імператрыцы свайго чалавека і паставіць яго на пост, што служыў крыніцай усялякага багацця і ўшанаванняў".

У ліку авантурыстаў быў і малады князь Канцямір — прыгажун, абцяжараны шматлікімі пазыкамі. Ён доўга блукаў вакол імператарскага палаца, спадзеючыся на выпадковую сустрэчу і нават двойчы — нібыта памыліўшыся дзвярыма — трапляў у асабістыя пакоі гаспадыні. Але выніку гэта не прынесла, і тады Дзмітрый вырашыў пайсці ва-банк. Афіцэр пракраўся да Кацярыны і ўпаў да яе ног з прызнаннямі ў каханні.

Ён ведаў, што Пацёмкіну ўдалося дасягнуць свайго менавіта дзякуючы такой дзёрзкасці. Але гэтым разам імператрыца была ў іншым настроі. Яна пазваніла, і нахабніка арыштавала варта. Зрэшты, нічога страшнага яму не зрабілі. Кацярына ставілася да такіх выхадак вельмі паблажліва і проста загадала пасадзіць Дзмітрыя ў кібітку ды адвезці яго да старэйшага і паважанага сваяка — Захара Чарнышова.

Мяркуючы па ўсім, той і сам падтрымліваў Канцяміра ў яго спробах заняць месца фаварыта імператрыцы. Аднак калі яны пацярпелі фіяска, Чарнышову нічога не заставалася, як выправіць няўдалага палюбоўніка Кацярыны падалей ад сталіцы і абвясціць, што ён зусім звар'яцеў. Фармальнай падставай для заключэння ў крэпасць стала забойства імператарскага палаца з больш ці менш схаваным жаданнем і надзеяй. Ад часу да часу адзін з іх з'яўляўся пры двары, прадстаўлены якімнебудзь буйным саноўнікам, які зведваў шчасце правесці да імператрыцы свайго чалавека і паставіць яго на пост, што служыў крыніцай усялякага багацця і ўшанаванняў".

У ліку авантурыстаў быў і малады князь Канцямір — прыгажун, абцяжараны шматлікімі пазыкамі. Ён доўга блукаў вакол імператарскага палаца, спадзеючыся на выпадковую сустрэчу і



Рэвельская крэпасць. Малюнкі Ёгана Бротцэ

ў Крыме, Прычарнамор'і, на Балканах. Чынны ўдзел у той вайне ўзяў і будучы няўдалы фаварыт Кацярыны. Падпалкоўнік Ніжагародскага карабінернага палка князь Дзмітрый быў узнагароджаны ордэнам Святога Георгія IV ступені, а некаторыя яго подзвігі нават засталіся ў ваеннай гісторыі.

Пасля паразы пад Бухарэстам турэцкая армія адступіла за Дунай. 4 лістапада 1771 года атрад лёгкай кавалерыі Канцяміра (да 1,5 тыс. чалавек) дзякуючы рашучым і самастойным дзеянням камандзіра ўзяў крэпасць Журжу амаль без супраціву, захапіўшы немалыя трафеі. 27 верасня 1773 года атрад ужо палкоўніка Канцяміра каля крэпасці Турна разбіў турэцкую кавалерыю, якую ўзначальваў сам нікапольскі сераскір Ахмет-паша. Праціўнік у гэтым баі страціў да 1500 забітымі, а рускія страты склалі ўсяго 20 забітых і 145 параненых.

Аднак у выніку заключанага ў 1774 годзе мірнага пагаднення Малдова была вернута Бліскучай Порце. Канцямір, які прэтэндаваў на яе трон, мог разглядаць гэта як здраду. Ён чым далей тым болей разумеў, што яго амбіцыі ніяк не ўпісваюцца ў грандыёзныя планы Кацярыны — яе, так бы мовіць, грэчаскі праект.

Вось што піша на гэты конт Казімір Валішэўскі: "Яшчэ ў 1762 годзе (…) Кацярына зацікавілася гэтым планам. І гэтая цікавасць не астыла ў ёй да самай яе смерці. Праўда, то была прыгожая мара, якая прыняла ва ўяўленні Кацярыны чароўныя абрысы: уваскрашэнне Грэцыі, вызваленне паўднёвых славян змяняліся іншымі прывідамі, аднолькава светлымі, але менш бескарыслівымі. Кацярыне ўяўляўся Канстанцінопаль, які адкрывае вароты хрысціянскаму свету, прадстаўніком якога з'яўлялася б рускае войска; ёй маляваўся на купале Св. Сафіі васьміканцовы грэцкі крыж замест паўмесяца, і ля падножжа крыжа шчыт з двухгаловым імператарскім арлом... Вось чаму другі сын Паўла быў названы Канстанцінам, а не Пятром або Іванам, вось чаму ў яго была карміцелька-грачанка і дзядзька-грэк..."

Паводле планаў імператрыцы, менавіта яе ўнуку Канстанціну і было наканавана ў будучыні кіраваць Малдовай і Валахіяй — асновай грэчаскай манархіі яе мары. А ўжо адтуль праз нейкі час з трыумфам перабрацца ў Царград.

Пры такім раскладзе ў апошняга з роду Канцяміраў не было ніводнага шанцу заняць трон Малдовы. І ён гэтага не мог не разумець. Не выключана, што крушэння надзей было цалкам дастаткова, каб Дзмітрый з'ехаў з глузду. Зрэшты, зусім не выключаны і іншы варыянт: ён быў хутчэй дзіваком, чым хворым. А вось вар'ятам яго старанна імкнуліся зрабіць высокапастаўленыя добразычліўцы — і на тое былі прычыны.

Крушэнне мараў

Зрэшты, тут кідаецца ў вочы і яшчэ адна акалічнасць. Дзіўным чынам першыя згадкі пра вар'яцтва ў 1774 годзе супалі з завяршэннем чарговай вайны з Турцыяй, калі Расія атрымала вельмі выгадныя ўмовы міру, значна ўзмацніўшы свае пазіцыі

Жаніцьба вар'ята

Далей загадкі адносна лёсу Дзмітрыя Канцяміра працягваюцца. У 1789 годзе ў Рогані на грошы князя была пабудаваная Узнясенская царква — адпаведна, вар'ят, заключаны ў Рэвельскую крэпасць, мог самастойна распараджацца сваімі грашыма. Ды і гэта яшчэ не ўсё. Як выявілася, неўзабаве ён… ажаніўся. Захаваўся ліст, напісаны ў ссылку вядомаму масону Івану Тургеневу пісьменніцай Лізаветай Хераскавай — жонкай вядомага паэта Міхаіла Хераскава. Там ёсць такія радкі: "…звар'яцелы Канцямір ажаніўся з пляменніцай маёй Лізаветай Андрэеўнай Хрушчовай, адважная гэта дзяўчына, і відаць, што яна смерці не баіцца..." Хаця Дзмітрыя зноў называюць "вар'ятам", узнікае відавочны парадокс: чалавек, афіцыйна прызнаны недзеяздольным, не мог заключаць ніякія здзелкі, а тым больш — ажаніцца.

Аднак у гэтым шлюбе сапраўды паўсталі сур'ёзныя праблемы. Звязаныя яны былі з парушэннем царкоўных законаў: выйшла, што вянчанне адбылося на Сырным тыдні — апошнім перад Вялікім постам, альбо на Масленіцу. Парушэнне ўмовы заключэння шлюбу дазваляла лічыць яго несапраўдным, чым адразу ж і скарыстаўся Канцямір. Чаму? Пра гэта можна меркаваць з яго ўласных слоў. Дзмітрый сцвярджаў, што яго "п'янага з ёй ажанілі, і што я, прачнуўшыся, нямала здзівіўся бачыць яе з сабою!"

Неўзабаве дзіўны шлюб быў скасаваны. На гэтым гісторыя не скончылася — пра што мы распавядзем пазней. Пакуль жа адзначым наступнае: падобна на тое, што ўсе дзеці князя, уключаючы будучую жонку Ігната Марцінкевіча Соф'ю, былі народжаныя зусім не ад дачкі брыгадзіра Лізаветы Хрушчовай.

Разам з жонкай брат нашага класіка атрымаў і карысныя сувязі. Напрыклад, генерал-губернатары Магілёўскай (Беларускай) губерні — і Захар Чарнышоў (1778 — 1782), і Пётр Пасек (1782 — 1796), — а таксама віцэ-губернатар Васіль Няронаў (1773 — 1777) былі сваякамі Дзмітрыя Канцяміра. Праўда, да моманту жаніцьбы Ігната Марцінкевіча з яго дачкой яны ўсе ўжо сталі "былымі". Але ў святле гэтых сямейных сувязяў Яна Марцінкевіча і яго сына Ігната — а яны, дарэчы, і самі былі сваякамі такога ўплывовага чалавека, як каталіцкі Мітрапаліт Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч — сям'ю нашага класіка наўрад ці можна ўявіць у традыцыйным для беларускай гісторыі літаратуры ключы: бедных шляхціцаў, якія ледзь ці не з сахой апрацоўвалі арандаваны імі кавалачак зямлі.

Ці быў цесць Ігната Марцінкевіча багатым? Думаю, гэтага эпітэту будзе замала, каб апісаць яго фінансавы стан. У 1803 годзе, якраз незадоўга да вяселля, стрыечны брат Дзмітрыя Канцяміра Васіль Пасек так ацэньваў яго маёмасць: 16000 душ і больш за 400000 рублёў, якія знаходзіліся ў Дзяржаўным пазыковым банку! Аднак магчыма, што гэтыя скарбы збольшага і былі прычынай бедстваў князя. Менавіта Захара Чарнышова і Пятра Пасека Канцямір лічыў крыніцай сваіх праблем, паколькі яны, як блізкія сваякі і ўплывовыя людзі свайго часу, маглі разлічваць атрымаць спадчыну.

■■■

Паводле некаторых звестак, свабоду Дзмітрыю прынесла толькі смерць Кацярыны II, калі Павел I у лістападзе 1796 года адным з першых сваіх указаў загадаў вызваліць усіх палітычных вязняў. Аднак насамрэч Дзмітрый правёў у турме ўвесь тэрмін кіравання Паўла і выйшаў ужо пры Аляксандры.

Тут нам трэба зрабіць невялікае адступленне, каб распавесці пра лёс яшчэ аднаго сваяка Канцяміра (і сваяка Яна Марцінкевіча), які адыграў значную ролю як у вызваленні князя, так і ў тым, што ён адпісаў сваю спадчыну ў тым ліку і пазашлюбнай дачцэ Соф'і. Зрабіць тое тым больш прыемна, што жыццё і творчасць гэтага сваяка — і не проста сваяка, а яшчэ аднаго паэта — цесна звязаныя з Магілёвам. Васіль Васільевіч Пасек — сын сястры маці Канцяміра — меў не менш трагічны лёс, чым яго брат.

Зміцер ДРОЗД, гісторык, архівіст

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст."; "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст."; "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст."; "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст."; "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:

■ Выстава **"Марк Шагал: Колер Любові"** — да 8 кастрычніка.
■ Выстава **"Напалеон Орда. Ілюстраваная энцыклапедыя краіны"** — да 3 снежня.
■ Выстава **"Эрнст Барлах — Кетэ Кольвіц. Пераадольваючы існаванне"** — з 7 кастрычніка да 3 снежня.
■ Выстава **"Горад. Архітэктура. Мы"** — да 1 кастрычніка.
■ Выстава **"З кніжнай скарбніцы"** (выданні друкарняў Беларусі XVI — першай паловы XIX стст.) — да 19 кастрычніка.
■ Выстава **"Скарбы Старажытнага Егіпта"** — да 10 снежня.
■ Выстава **"Магія старых фатаграфій"**.
■ Арт-праект **"4 вымярэнні сучаснага мастацтва Беларусі"** (музыка, жывапіс, паэзія, танец) — 1 кастрычніка. Пачатак а 19-й.
■ Забаўляльна-пазнавальная экскурсія для дзяцей 8 — 14 гадоў **"Самыя-самыя..."**.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава альтэрнатыўнай фатаграфіі Віктара Жураўкова **"Manuum hominum"** — да 1 кастрычніка.
■ Выстава моды і аксесуараў эпохі Рамантызму з калекцыі Ігара Сурмачэўскага **"І паланэз пачаць пара"** — да 13 студзеня 2018-га.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць сем музеяў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.

Выставы:

■ Выстава **"Скарына — асветнік–гуманіст"**.
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"** — да 30 верасня.
■ Фотапраект Аліка Замосціна **"Жыццё як выпадак..."** — да 1 кастрычніка.
■ Выстава **"Моднае стагоддзе"** (прадстаўлены гістарычныя касцюмы з прыватнай калекцыі Аляксандра Васільева) — да 10 студзеня 2018-га.
■ Выстава **"Да! Гэта Мінск"** фотаклуба "Мінск" — у Галерэі музея.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Выстава **"Імёны Рэвалюцыі"** — да 29 кастрычніка.
■ Святло-музычная выстава **"Атлантыда"** — да 8 кастрычніка.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.
■ Выстава **"Візіты і візіткі: дыпламатыя ў кішэні"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".
■ Выстава работ навучэнцаў гімназіі № 75 імя П.Масленікава **"Мой родны кут ..."** — да 31 кастрычніка.
■ Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага 2018-га.

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава-прэзентацыя **"Масонскія знакі"** — з 4 да 10 кастрычніка.
■ Выстава **"Загадка архіва вялікага Штэйна"** (у рамках акцыі "Даступны музей") — да 30 верасня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава вышытых карцін **"Я вам чароўны свет адкрыю..."** — да 22 кастрычніка.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Літоўская прэс–фатаграфія. 15 гадоў"** — да 22 кастрычніка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародны выставачны праект **"Заходняя Беларусь: гісторыя паўсядзённасці"** — да 30 верасня.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Анімацыйная праграма **"Немагчымае магчыма: на аўдыенцыі ў войта!"**

Другі паверх Слуцкай брамы

■ Часовая экспазіцыя **"З малітвай на вуснах"** — да 30 верасня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
- **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
- **Праспект Незалежнасці, 44.**
- **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
- **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
- **Праспект Пераможцаў, 5.**
- **Вуліца Рабкораўская, 17.**
- **Праспект Незалежнасці,168, В.**
- **Вуліца Лабанка, 2.**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародная выстава **"Ultima ratio Regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII — пачатку XVIII стст."** — да 21 кастрычніка.
■ Выстава мастацкай суполкі **"Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)"** — да 16 лістапада.
■ Квэст **"Вайна і Мір, альбо Таямніца дзвюх скрынь"** — кожную пятніцу.

Пачатак а 15-й.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"** — да 30 верасня.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
■ Выстава **"Страчаныя абліччы"** — з 4 кастрычніка да 2 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава твораў Ілоны Касабука **"Прызнанне гораду"** — да 1 кастрычніка.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выставачны праект **"Мінск скульптурны"** — да 1 кастрычніка.
■ Выставачна-інтэрактыўны праект **"Сустрэча з майстрам"**.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Разам з Мінскам"** (мастацкі тэкстыль, кераміка) — да 14 кастрычніка.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.

■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.

■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстава **"Вокны Мінска"** — да 1 кастрычніка.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Гомель і гамяльчане напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны"** (выставачная зала).
■ Выстава **"Бітва матораў"** (хол музея).

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2 68 96.

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
■ Выстава карцін Івана Струкава **"Саюз вады і зямлі"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра **"Батлейка"**.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.

■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.

г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.

■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ

г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).

■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава **"Адлюстраванне часу. Алесь Квяткоўскі і вучні-архітэктары БНТУ"** — да 14 кастрычніка.
■ Выстава фотаздымкаў **"Спадчына і прырода"** — да 14 кастрычніка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **1 кастрычніка — Святочны канцэрт, прысвечаны Дню музыкі** (у праграме — "Сімфонія №5" Л.ван Бетховена; фрагменты новай пастаноўкі балета "Карсар").Пачатак а 18-й.
■ **4 — "Viva la mama!" ("Няхай жыве мама!")** (опера ў 2-х дзеях) Г.Даніцэці. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **7 — "Карсар"** (балет у 3-х дзеях) А.Адана, Ц.Пуні, Л.Дэліба, Р.Дрыга, П.Альдэнбургскага. Прэм'ера.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

Гастролі Стаўрапальскага акадэмічнага тэатра драмы імя М. Ю. Лермантава

■ **30 верасня, 7 кастрычніка — "Сястра мая — русалачка"** (рамантычная легенда па матывах казкі Г.Х.Андэрсана) Л.Разумоўскай. Пачатак аб 11-й.
■ **30 верасня, 7 кастрычніка — "Жаніха выклікалі, дзяўчынкі?"** (лірычная камедыя ў 2-х дзеях) А.Іванова. Пачатак а 18-й.
■ **1 — "Стойкі алавяны салдацік"** (рамантычная легенда) Г.Х.Андэрсена. Пачатак аб 11-й.
■ **1 — "Чамаданчык"** (апакаліптычная камедыя) Ю.Палякова. Пачатак а 18-й.
■ **2, 6 — "Небяспечныя сувязі"** (па матывах рамана Ш.дэ Лакло) К.Хэмптана.
■ **3 — "Боінг-боінг"** (камедыя ў 2-х дзеях) М.Камалеці.
■ **4 — "Акампаніятар"** (камедыя-меладрама ў 2-х дзеях) А.Галіна.
■ **5 — "Шыкоўнае вяселле"** (камедыя палажэнняў) Р.Хоўдана.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

■ **30 верасня — "Дажыць да прэм'еры"** (камедыя) М.Рудкоўскага.
■ **1 кастрычніка — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **3 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **4 — "Сіндром Медэі"** (трагедыя) Ю.Чарняўскай. Прэм'ера.
■ **5 — "А ці будзе заўтра" ("7 дзён без антракту")** Д.Багаслаўскага.
■ **6 — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.
■ **7 — "Залатое сэрцайка"** (інтэрактыўная казка) С.Навуменка. Пачатак аб 11-й.
■ **7 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **30 верасня — "Горад клоўна Піка"** (тэатральна-цыркавая фантазія) М.Барценева.
■ **1 кастрычніка — "Фенька"** (неверагодная гісторыя) Л.Панцялеева.
■ **7 — "Адважныя браты"** (лясная казка ў 2-х дзеях) Г.Мацвеева. Пачатак спектакляў — аб 11-й.

УВАГА!

ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!

Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41
(факс)
kultura@tut.by